ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ, КІРАЎНІЦТВА ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВА ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР, МІНІСТЭРСТВА КІНЕМАТАГРАФІІ БССР І КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫХ УСТАНОЎ ПРЫ СОВЕЦЕ МІНІСТРАЎ БССР.

№ 45 (745) | Субота, 29 кастрычніка 1949 года. | Цана 50 кап.

Разбіўшы магнацкія путы, з Усходу
Прынёс правадыр вызваленне народу.
Мы дружбай з'яднаны,
сям'ёю адзінай
Ідзём к комунізму з усёю Радзімай!

ПАД СЦЯГАМ СТАЛІНА

30-га кастрычніка наш народ урачыста адзначыць сваё вялікае свята — дзесятую гадавіну ўз'яднання беларускага народа ў адзінай Беларускай Совецкай дзяржаве.

З той пары, калі Совецкая Армія вымяла з Заходняй Беларусі паноў і капіталістаў; з той пары, калі народы Совецкага Саюза прынялі нашых заходніх братоў у сваю сям'ю — народ былой Заходняй Беларусі адчуў сябе сапраўдным гаспадаром жыцця. Ён навекі ўдзячны вялікаму Сталіну і большэвіцкай партыі за сваё вызваленне, за светлы шлях, які перад ім раскрыўся.

Дзесяць год непазнавальна змянілі аблічча былой Заходняй Беларусі. Няма такога горада, дзе-б не працавалі новыя заводы і фабрыкі, пра якія раней зямля Белавежы і Нёмна не магла і сніць. Запалкі, сукно, цэмент, шкло, сельскагаспадарчыя машыны і шмат чаго іншага вырабляюць прадпрыемствы Гродна, Пінска, Ваўкавыска, Ліды. Праца стала справай гонару кожнага рабочага.

Працоўнае сялянства цвёрда стала на шлях калектывізацыі. Для яго яскравым прыкладам перавагі калгаснага ладу з'явіліся поспехі калгасаў усходніх абласцей нашай рэспублікі і ўсяго Совецкага Саюза. У адной толькі Брэсцкай вобласці гэтай вясной сяўбу правяло 346 маладых калгасаў. А цяпер іх—561. Лік калгасаў, нягледзячы на жорсткае супраціўленне класавых ворагаў, няспынна расце. Хутка настане дзень, калі трактары заарують апошнюю палыновую мяжу.

Змяніліся і людзі заходніх абласцей Беларусі. Былыя батракі сталі майстрамі высокага ўраджаю, наватарамі прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Імі ганарыцца ўся рэспубліка.

Дванцаць галоў пакутвала Заходняя Беларусь пад прыгнётам польскіх капіталістаў і памешчыкаў. Яна не мела нават свайго імя, польскія каланізатары пагардліва называлі яе «ўсходнімі крэсамі» і адзіным іх клопатам быў клопат, як мага больш высмактаць багацця з беларускай зямлі, абрабаваць дашчэнту і так ужо абрабаваны беларускі працоўны народ.

Кадма, што аб культурным развіцці Заходняй Беларусі не магло быць і гутаркі. Гэта быў край незвычайнай галечы і цемры. Толькі 30 процантаў дарослага насельніцтва было пісьменным. Не было беларускіх газет, ніводнай вышэйшай навучальнай установы, ніводнага тэатра. «Культурай» паноў была «культура» эксплаатацыі, паланізацыі, Картуз-Бярозы і Лукішак. Лепшыя прадстаўнікі народа, дзеячы культуры працавалі альбо ў падполлі, альбо напалымяным радком пілавалі турэмныя краты.

І толькі Сталінская Канстытуцыя, якую атрымалі, як найвялікшы дар, працоўныя Заходняй Беларусі ўвосень 1939 года, адкрыла для іх найвялікшыя магчымасці для працы, для культурнага будаўніцтва.

Большэвіцкая партыя, вялікі Сталін праявілі нямала клопатаў, каб узняць адсталыя вобласці былой Заходняй Беларусі да ўзроўню ўсяго Совецкага Саюза. Тое, што было зроблена на заходніх землях за гады совецкай улады ў першыя гады пасля вызвалення ад панскага ўціску, імкнуліся знішчыць нямецкія фашысты. Яны палілі будынкі школ, больніц і клубаў, але не маглі знішчыць асноўнага—любві працоўных беларусаў да соцыялістычнага ладу, адданасці комуністычнай партыі і вялікаму Сталіну.

Сёння працоўныя заходніх абласцей соцыялістычнай Беларусі могуць ганарыцца сваімі поспехамі ў культурным будаўніцтве, якіх яны дасягнулі пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі.

Брэст і Гродна, Пінск і Баранавічы, Маладзечна і Навагрудак — кожны з гэтых гарадоў стаў горадам асветы. У адной толькі Гродзенскай вобласці маецца педагагічны інстытут, педагагічнае вучылішча, культасветвучылішча, каператыўны і будаўнічы тэхнікумы, заатэхнікум і тэхнікум фізічнай культуры. А колькі юнакоў і дзяўчат заходніх абласцей вучацца ў Маскве, Ленінградзе, Мінску і іншых гарадах Совецкага Саюза!

Совецкая ўлада дала ўсе магчымасці шырока раскрыць творчыя сілы народа. Расквітнела народная творчасць, мастацкая самадзейнасць. Цяпер амаль не знойдзеш такой вёскі ці мястэчка, дзе не было-б харавога, музычнага, драматычнага ці іншага гуртка. Агляды мастацкай самадзейнасці дапамагаюць выяўленню ўсё новых і новых талентаў з народа. Варта прыгадаць, якой папулярнасцю карыстаецца ансамбль песні і танца пад кіраўніцтвам народнага артыста БССР Р. Шырмы, народны хор з вёскі Вялікае Подлессе, Баранавіцкай вобласці, пад кіраўніцтвам заслужанага дзеяча мастацтва БССР Г. Цітовіча. Новай і радаснай з'явай у культурным жыцці з'яўляюцца святы песні.

З Заходняй Беларусі прышло да нас нямала мастакоў, скульптараў, артыстаў, пісьменнікаў. Усім вядомы імёны паэтаў Піліпа Пестрака, Максіма Танка, Валянціна Таўлая.

Але сапраўдны росквіт іх талентаў пачаўся толькі пры совецкай уладзе. Максім Танк стаў адным з любімейшых паэтаў нашага народа, грамадскім дзеячом. Яго вершы і паэмы вядомы далёка за межамі Беларусі. За кнігу вершаў «Каб ведалі» М. Танку была нададзена годнасць лаўрэата Сталінскай прэміі.

Шмат і плённа працуюць нашы таленавітыя пісьменнікі Піліп Пестрак, Міхась Машара, Мікола Засім, Янка Брыль, Ніна Тарас і іншыя.

Ва ўсіх заходніх абласцях ідзе вялікае будаўніцтва; ствараюцца новыя калгасы, а створаныя раней—змагаюцца за высокія ўраджаі, за новыя адносіны да працы, за новы быт—пра ўсё гэта мы, на жаль, не можам прачытаць у мастацкай літаратуры.

Не толькі пісьменнікі—выхадцы з былой Заходняй Беларусі, але і ўсе беларускія совецкія пісьменнікі ў вялікім даўгу перад працоўнымі заходніх абласцей Беларусі. Паказаць, якія грандыёзныя змены адбыліся там за дзесяць год,—наш неадкладны абавязак.

Урачыста святкуючы дзесяцігоддзе слаўнага ўз'яднання, увесь беларускі совецкі народ радасна глядзіць у будучыню і цвёрда ўпэўнены, што адзная Беларуская Совецкая дзяржава будзе заўсёды ў першых радах будаўнікоў комунізма.

У АДЗІНАЙ СЯМ'І СОВЕЦКІХ НАРОДАЎ

*

Л. Д. ДЗЕМЯХ,
намеснік Старшыні Вярхоўнага Совета БССР

*

У дзень слаўнага дзесяцігоддзя з дня ўз'яднання нашага народа ў адзінай Совецкай Беларускай дзяржаве мімаволі ўспамінаецца, як жылі і змагаліся беларусы заходніх абласцей пад уціскам панскай Польшчы, які складаны і гераічны шлях яны прайшлі. Яшчэ зусім нядаўна голад, холад, цемра, непісьменнасць былі спадарожнікамі працоўнага беларуса. Туберкулез, каўтун, малярыя і іншыя хваробы штогод адбіралі жыццё ў тысяч людзей. Працоўны чалавек жыў упрогаладзь, а шэсць тысяч памешчыкаў заходніх абласцей Беларусі трымалі ў сваіх руках больш паловы ўсёй зямлі.

Мне, як былой батрачцы, многае давялося перажыць самой. І вось, перачытваючы сёння творы нашых беларускіх пісьменнікаў, нельга не ўспомніць верш «Доля батрачкі» народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. Колькі жыццёвай праўды ў гэтым вершы, як глыбока і хвалююча паказаны горкі лёс батрачкі. Гэткім быў лёс пераважнай большасці жанчын заходніх абласцей Беларусі, лёс усяго працоўнага сялянства.

Маці ў службу выпраўляе
Родную дзяціну.
Выпраўляючы хавае
Горкую слязіну.
— Будзь паслушная, дачушка,—
Навучае матка.
— Дагаджай чужым ты, служка,
Ды цярпі, дзіцятка!
Не адзін раз твае вочкі
Заплывуць слязою.
Твая доля цямней ночкі—
Цяжка быць слугою!

Не лепшым было становішча і рабочых у заходніх абласцях Беларусі. На так званых «Крэсах усходніх» рабочы атрымліваў плату на 45—65 процантаў ніжэйшую, чым польскі рабочы ў Варшаве. Рабочы дзень дасягаў 12—14 гадзін. Беспрацоўе было надзвычай вялікае. У 1937 годзе ў заходніх абласцях Беларусі беспрацоўных было больш, чым рабочых.

Толькі пасля ўз'яднання беларускага народа ў адзінай Беларускай Совецкай дзяржаве працоўныя заходніх абласцей Беларусі зрабіліся раўнапраўнымі грамадзянамі вялікай краіны соцыялізма і пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна пачалі будаваць сваё жыццё на новых соцыялістычных асновах.

Развіццё прамысловасці і калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях Беларускай ССР стварылі эканамічную базу для заможнага і культурнага жыцця працоўнага народа.

У першыя-ж месяцы пасля вызвалення была праведзена нацыяналізацыя буйной прамысловасці, ліквідавана беспрацоўе, разгорнута будаўніцтва новых фабрык і заводаў. Толькі за адзін год прадукцыя прамысловых прадпрыемстваў заходніх абласцей БССР узрасла ў параўнанні з 1938 годам больш, чым у два разы.

Усё гэта было дасягнута дзякуючы братняй дапамозе вялікага рускага народа і іншых народаў Совецкага Саюза. Асабліва многа дапамагалі новым абласцям, якія ўступілі ў Совецкую дзяржаву, рабочыя індустрыяльных раёнаў совецкай краіны. Велізарныя сродкі былі ўкладзены ў капітальнае будаўніцтва заходніх абласцей Беларусі ў 1940 годзе (92 мільёны рублёў), што дазволіла паступова змяніць аблічча заходніх абласцей БССР. Напрыклад, у Гродзенскай вобласці ў 1940 годзе было ўжо больш 450 прадпрыемстваў. Пачалі працаваць Ваўкавыскі цаментны завод, заводы па вырабу скуры, сельскагаспадарчых машын і іншыя.

У абласным цэнтры былі пушчаны ў ход электрастанцыя, тытунёвая фабрыка, фанерны, скураны, мылаварны заводы, хлебакамбінат. Было пачата будаўніцтва новай абутковай фабрыкі і рэканструкцыя веласіпедняга завода. Гродна—у мінулым горад саматужных майстэрань—ператварыўся ў прамысловы цэнтр з разнастайнымі прадпрыемствамі.

Карэнныя змены адбыліся і ў сельскай гаспадарцы. Совецкі ўрад перадаў працоўнаму сялянству звыш аднаго мільёна гектараў зямлі, якая належала памешчыкам і асаднікам, дзесяткі тысяч галоў жывёлы, вялікую колькасць сельскагаспадарчага інвентара. Толькі ў Гродзенскай вобласці была перададзена зямля 20.806 беззямельным і малазямельным сялянскім гаспадаркам.

Перадавыя сяляне, пераймаючы вопыт калгаснікаў усходніх абласцей БССР, дабраахвотна прыступілі да арганізацыі калектыўных гаспадарак. Ужо ў 1940 годзе было арганізавана ў заходніх абласцях Беларусі 1.115 калгасаў, у якія ўступіла звыш 30.000 сялян. Была арганізавана 101 машынна-трактарная станцыя, у якіх налічвалася шмат трактароў, 368 сеялак, 419 трыераў і шмат іншага сельскагаспадарчага інвентара.

У гарадах і вёсках заходніх абласцей БССР у 1940 годзе налічвалася 4.000 пачатковых, сямігадовых і сярэдніх школ, у якіх дзеці вучыліся на роднай мове. Былі адкрыты чатыры інстытуты, 12 тэхнікумаў, 5 драматычных тэатраў, філармонія, сто кінотэатраў, ансамбль песні і танца. Я сама да прыходу совецкай улады ні разу не бачыла кіно, а цяпер кіноперасоўкі штотыднёва наведваюць нашы вёскі.

Працоўныя заходніх абласцей БССР, дзякуючы совецкай уладзе, прымаюць актыўны ўдзел у дзяржаўным кіраўніцтве. 18 тысяч рабочых і сялян працавала на кіруючых і гаспадарчых работах.

Мірная творчая праца беларускага народа была часова спынена вераломным нападам нямецка-фашысцкіх захопнікаў на Совецкі Саюз.

Па закліку таварыша Сталіна беларускі народ, як і ўсе народы Совецкага Саюза, узняўся на абарону сваёй соцыялістычнай Радзімы.

Мне таксама давялося ўдзельнічаць у барацьбе супраць вераломнага ворага ў радах народных мсціўцаў. Я ўласнымі вачыма бачыла, якая гэта была сапраўды гераічная барацьба.

Совецкая Армія пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна разграміла гітлераўскую армію і вызваліла совецкую зямлю ад фашысцкіх захопнікаў. Сваім збавеннем ад крывавага прыгнёту нямецка-фашысцкіх акупантаў беларускі народ абавязаны гераічнай Совецкай Армі, вялікаму рускаму народу і ўсім братнім народам Совецкага Саюза, мудрай большэвіцкай партыі, геніяльнаму палкаводцу таварышу Сталіну.

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пры братняй дапамозе вялікага рускага народа і ўсіх народаў СССР, беларускі народ за кароткі тэрмін дамогся сур'ёзных поспехаў у справе ліквідацыі цяжкой спадчыны нямецка-фашысцкай акупацыі.

Сяляне-аднаасобнікі ўсё больш і больш пераконваюцца ў тым, што калгасны шлях ёсць адзіны і правільны шлях да заможнага і культурнага жыцця. Ужо арганізавана звыш трох тысяч калгасаў, якія аб'ядноўваюць звыш ста тысяч бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. З кожным днём колькасць калгасаў павялічваецца. У Гродзенскай вобласці — 585 калгасаў. Толькі за апошнія два месяцы арганізавалася 254 калгасы. У вобласці за чатыры гады пабудавана 8 тысяч новых дамоў для калгаснікаў. З года ў год пашыраецца пасеўная плошча. Толькі за 1948 год колькасць рагатай жывёлы павялічылася на 3.600 галоў.

Ажыццяўляючы рашэнні лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б), калгаснікі рэспублікі здолелі дасягнуць значных поспехаў. Сёлетнія хлебанарыхтоўкі паказалі, што калгаснікі аддаюць вялікую ўвагу выкананню дзяржаўнага задання, ставячыся да гэтай палітычна-гаспадарчай кампаніі, як да важнейшай дзяржаўнай справы.

Калгаснікі і калгаснікі заходніх абласцей БССР разам з усімі калгаснікамі рэспублікі нястомна працуюць над умацаваннем сваіх каляктыўных гаспадарак, над пашырэннем жывёлагадоўлі.

Вялікія поспехі дасягнуты таксама і ў галіне культурнага будаўніцтва ў заходніх абласцях. У 4.220 школах навучаецца 505.000 дзяцей, працуе 5 настаўніцкіх і адзін педагагічны інстытут. У вышэйшых і сярэдніх навучальных установах краіны вучацца тысячы юнакоў і дзяўчат. Адчынены дамы культуры, клубы, хаты-чытальні, бібліятэкі. Працуюць тэатры, кіноперасоўкі, каляктывы мастацкай самадзейнасці.

У гарадах і вёсках толькі Гродзенскай вобласці — 911 пачатковых, сямігадовых і сярэдніх школ, 109 вячэрніх школ, 3 педвучылішчы, 10 спецыяльных і сярэдніх навучальных устаноў, педінстытут. У пачатковых, сямігадовых і сярэдніх школах навучаецца 110 тысяч дзяцей.

Совецкая дзяржава праяўляе велізарныя клопаты аб здароўі працоўных. 59 больніц, 64 паліклінікі і амбулаторыі, 86 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, каля ста іншых медыцынскіх устаноў у гарадах і вёсках толькі Гродзенскай вобласці абслугоўваюць насельніцтва.

Дзякуючы соцыялістычным метадам працы, у заходніх абласцях БССР вырасла новая армія перадавікоў вытворчасці.

Работніца Гродзенскай абутковай фабрыкі № 1 Радчанкава выконвае свой вытворчы план на 300 процантаў, Буевіч—на 200 процантаў, Хрысцюк—на 180 процантаў. Лепшыя калгаснікі БССР, як Калыска, Калола, Кухарава, Шкурко, Стыкут і іншыя, атрымалі ганаровае званне Герояў Соцыялістычнай Працы.

Перадавыя людзі, лепшыя сыны і дочкі заходніх абласцей рэспублікі абраны ў дзяржаўныя кіруючыя органы краіны — Вярхоўныя Советы СССР і рэспублікі, у мясцовыя Советы. Сярод іх—выдатны рэволюцыянер, партыйны кіраўнік, сакратар Гродзенскага абкома партыі С. Прытыцкі, вядомая партызанка, адказны партыйны работнік ЦК КП(б)Б Федасюк, сяляне з Гродзеншчыны, з Брэстчыны, з Віцебшчыны. Па Гродзенскай вобласці абраны дэпутатамі ў мясцовыя Советы 5.638 чалавек. У Жалудокім раёне толькі ў праўленні калгасаў абрана 225 жанчын-актывістак.

Далёка за межамі рэспублікі вядомы совецкаму чытачу нашы пісьменнікі і дзеячы мастацтва, якія паходзяць з заходніх абласцей Беларусі. Гэта М. Танк, П. Пестрак, В. Таўлай, М. Засім, Я. Брыль, М. Машара, Н. Тарас, выдатныя этнографы і кіраўнікі хораў — народны артыст БССР Р. Шырма і заслужаны дзеяч мастацтва БССР Г. Цітовіч.

Толькі ў нашай краіне працоўны чалавек з'яўляецца сапраўдным гаспадаром свайго шчасця і дзяржаўным дзеячом. Гэта стала магчымым толькі ў выніку перамогі Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, у выніку перамогі соцыялізма ў нашай краіне, дзякуючы сталінскай нацыянальнай палітыцы, дзякуючы палітыцы раўнапраўя і дружбы народаў СССР.

Пімен ПАНЧАНКА

Незгасальная вера

Я слухаў не раз, як над Бугам
Калгасныя нівы шумяць;
Я бачыў не раз, як над Нёмнам
Высокія трубы дымяць;
Ідзе па краіне з Гродні
Рэкордная слава ткачых;
Асушваюць кобрынцы багну,
Пружанцы карчуюць карчы...
І нават не хочацца верыць,
Што тут, на зямлі дарагой,
І братнюю працу і песню
Таптаў пан вялькожнай нагой.
Ды нельга забыць гэта...
Слова,
Схіні на хвіліну гады!

Тады тут яны царавалі.
Але і тады, і тады—
Баяліся нашае песні,
Ад песні баяліся рэха.
І цені дратоў пагранічных,
Як краты, ляжалі на рэках.
Хацелася ім перасекчы
І зоры, і рэкі на двое,
З усходу ідучае сонца
Суправаджаць пад канвоем.
Ды рэкі драты прагрызалі,
А рэха, пачуўшы ад песень,
Азёры кіпелі у штормах,
І буры займаліся ў лесе.

Калі-ж па-над Нёмнам і Бугам
Сцягоў заалела зара,
Партрэты выносілі людзі
Любімага правадыра.
Аб тым, дзе партрэты хавалі,
Не стаў у братоў я пытаць.
Я ведаў: глыбока у сэрцах,
Каб вораг не здолеў дастаць.
Навекі запала у памяць,
Як людзі казалі тады:
«Мы верылі: Сталін к нам прыдзе
І нас уратуе з бяды!»

Успомніўшы тыя сустрэчы
Сярод ваўкавыскіх бароў,
Балюча мне слухаць, што дзесьці
Катуюць ізноў змагароў.
І горка чытаць мне, што піша
З Афінаў чыясьці сястра...
У катаў звярыныя рылы,
І прагнасць, і подласць, і страх.
Ім страшна, як колісь магнатам,
І нашае сонца, і спеў,
Які пачынае ўсе штормы,
Фарбуе у полымя гнеў.

Паўстанцы далёкай Суматры,
Паўднёвай Карэі сыны—
«Ён нам дапаможа!»—гавораць,
«Ён з намі!»—гавораць яны.
І гэта вялікая вера
Людзей у яго, аднаго
Вяла праз агонь да Шанхая
Кітайскага сябра майго.
Хай сталінскі воін ніводзін
З ім поплеч у наступ не йшоў—
Ішло з ім любімае імя,
Сцягоў калыхаючы шоўк.

ЦВІЦІ, КАЛАСУЙСЯ, МОЙ КРАЙ, ЦІ СОНЕЙКА ЗАХАД ЦІ ЎСХОД!

Ф. Мадораў — «Народны Сход у Беластоку». Фотарэпрадукцыя Г. Бугаенкі.

* * *

Максім ТАНК

Светлая дата

Адной з самых светлых дат у жыцці беларускага народа з'яўляецца дзень уз'яднання яго ў адзінай Беларускай Савецкай дзяржаве.

Праз дваццаць год жыцця ў жудаснай панскай няволі працоўныя Заходняй Беларусі пранеслі сваю мару аб гэтым шчаслівым дні. І не было такой сілы, якая магла-б пагасіць гэту мару, што натхніла народ на барацьбу і азарыла яго шляхі да перамогі. Народ з надзеяй тлядзеў на ўсход, дзе ззяла сонца Кастрычніцкай рэволюцыі, і нельга было ніякімі кратамі, калючымі засекамі, астрожнымі сценамі і хлуснёй засланіць ззянне гэтага сонца; праменні яго прабівалі ся ў самыя далёкія і глухія куткі маёй радзімы. Не было такой сілы, якая магла-б знішчыць пачуццё брацтва, адзінства з вялікім рускім народам. Нават будучы адлучаным ад сваіх братоў мяжой-граніцай, народ верыў, што надыйдзе час, калі ён будзе жыць у вялікай вольнай сталінскай сям'і народаў. І таму на прадстаўнікоў тагачаснай белапольскай улады, на розных войтаў, асаднікаў, ксяндзоў і паліцыю народ глядзеў як на захопнікаў, супраць якіх трэба нястомна змагацца. Гэта былі часовыя і выпадковыя «гаспадары». Народ заўсёды ставіўся да іх варожа, адмаўляўся плаціць падаткі, са зброяй у руках выступаў супраць прымусовай хутарызацыі, шарварак, канфіскацыі сялянскай маёмасці, карных экспедыцый, супраць паланізатарскай палітыкі Пілсудскага і яго катаў—розных косткаў, бернардскіх, бацянскіх і інш.

Аб усім гэтым яскрава гаворыць той факт, што толькі за адзін 1922 г. у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне адбылося каля дзевяцісот узброеных паўстанняў. Орган польскіх абшарнікаў «Рэч паспаліта» (2 кастрычніка 1925 г.) пісаў: «... на крэсах панує фатальны стан. Калі на працягу некалькіх год не будзе змен, мы будзем мець усеагульнае ўзброенае паўстанне, якое адарве ад нас значную частку тэрыторыі... На паўстанні ёсць шыбеніца, больш нічога... На ўсё мясцовае беларускае насельніцтва зверху да нізу павінен пасці жах, ад якога застыне кроў».

І скрыпеў над краем лес шыбеніц, і шырылася крывавае зарава над гераічнай кобрынчынай, навагрудчынай, гродзеншчынай, над краінай азёр—маладзечаншчынай. Азвярэлыя паланізатары крыжам і нагайкай стараліся пакарыць, апалячыць наш край.

У 1938 годзе на ўсёй Заходняй Беларусі не было ніводнай школы на беларускай мове, ніводнай культурна-асветнай арганізацыі, ніводнай лягальнай прагрэсіўнай газеты. Тысячы людзей арыштоўваліся толькі за тое, што асмельваліся дамагацца для сваіх дзяцей школы на сваёй роднай мове. Амаль пастаянная з'явай былі ў той час школьныя забастоўкі. Дзеці адмаўляліся ісці ў чужую і варожую для іх школу. Я помню, як у адной з навагрудскіх вёсак забаставалі дзеці. Убачыўшы іх на вуліцы, пацыйшоў войт і спытаў, што яны робяць. «Сваю школу будуем і помнік таварышу Леніну»,— адказалі яму дзеці. На гродзеншчыне настаўнік выкінуў са школы аднаго з сялянскіх хлапчукоў за тое, што той—як аб гэтым даведаўся настаўнік—цудоўна выконваў на скрыпцы рэволюцыйныя песні. І калі гэта не памагло, па загаду інспектара была склікана спецыяльная камісія дактароў, якая прызнала, што хлопчык хворы, таму яго трэба забраць ад бацькоў і «лячыць». І толькі дзякуючы таму, што бацька з сякерай у руках стаў на парозе хаты і не даў забраць свайго сына, гэта «камісія» мусіла адступіць.

Дзе ты сёння, мой безымянны дружа?! Можа загінуў як тысячы такіх-жа дзяцей свайго народа. А калі дажыў да светлай хвіліны вызвалення, напэўна недзе сёння вучыцца іграць, выступаеш на вечарах самадзейнасці, па калгасных вечарынках і граеш песні аб сённяшнім вольным і слаўным жыцці свайго народа.

Цяжка гаварыць аб лёсе беларускай культуры і літаратуры ў панскай Польшчы. Кожная спроба выдання лягальнай газеты, літаратурнага часопіса, зборніка вершаў душылася цэнзурай, якая на ўсё накладвала сваё вета, а рэдактароў, аўтараў, супрацоўнікаў, а часта і падпісчыкаў кідалі за краты. У астрогах і ў падполлі пісалі свае рэволюцыйныя вершы П. Пестрак і В. Таўлай, у цяжкіх умовах тварылі М. Васілёк, М. Машара, М. Засім, Крывец, Н. Тарас, А. Івер, Г. Новік і інш. Таму зборнікі большасці пісьменнікаў Заходняй Беларусі зышлі пасля вызвалення. Да гэтага-ж іх творы хадзілі толькі ў рукапісах ці завучваліся напамяць, або друкаваліся ў астрожных ды нелягальных рэволюцыйных часопісах, як «Краты», «Чырвоны сцяг», «Пралом» і іншыя. Зразумела, што шмат рэволюцыйных твораў таго часу загінула ў змрочных катоўнях дэфензівы і толькі нязначная частка, тое, што магло прабіцца за сцены Лукішак, Гродна, Вронак, за калючыя краты канцлагера Картуз-Бярозы, захавалася ў памяці народа. У зборніку вершаў М. Ісакоўскага ёсць запісаны ім у Заходняй Беларусі і перакладзены на рускую мову адзін з такіх безымянных вершаў пра тое, як мужык перавозіў паліцайскага праз раку. Гэта сатырычны верш М. Васілька. Шмат такіх твораў жыве ў памяці народа. Яны сталі народнымі, і невядома, хто іх напісаў, бо ў тыя часы не заўсёды можна было назваць сапраўднае імя аўтара.

Шчасце, калі доўга яго чакаеш і калі яно ў нейкі дзень прыходзіць, здаецца неспадзяваным. Я помню незабыўны той пагожы верасневы ранак, калі па нашых сёлах пранеслася вестка, што Совецкая Армія перайшла граніцу, што ў трывожную хвіліну зайны таварыш Сталін падаў нам руку дапамогі.

За дзесяткі кілометраў ішлі мы да шырокага Мядзельскага гасцінца, на якім бясконцым патокам імчаліся машыны, танкі, ехалі абозы. Часта байцы спыняліся на хвіліну, каб напіцца вады, змыць асеўшы на тварах дарожны пыл, каб прывітацца з намі, як са старымі знаёмымі, з братамі. Байцы бралі дзяцей на рукі, частавалі сваім паходным хлебам, дарылі на памяць чырвоныя зоркі. Плакалі шчаслівыя маткі. І дзень і ноч не разыходзіўся народ, са слязамі радасці глядзеў на вызваленчы паход сваёй арміі, якая несла з сабой мір і жаданую свабоду.

І ўжо на другі дзень, здаецца, іншы вецер павеяў над нашай краінай. Узыйшло другое сонца, бо радасна і прывольна стала дыхаць, спяваць, жыць на зямлі. Былыя бандракі і малазямельныя сяляне атрымалі зямлю. Упершыню тысячы іх плугоў пачалі разорваць праклятыя межы, уздымаць свежыя скібы зямлі пад свой засеў. Працоўныя Заходняй Беларусі пачалі будаваць новае соцыялістычнае жыццё. Знікла беспрацоўе, гора, нястача.

Але мірная праца народа была зноў парушана нямецкімі захопнікамі. Гады Вялікай Айчыннай вайны — гады гераічнага змагання нашага народа за сваю незалежнасць, за сваю будучыню, азароную вялікімі ідэямі Леніна—Сталіна.

Яшчэ і сёння, калі праехаць шляхамі маёй радзімы, па раёнах маладзечаншчыны, па партызанскіх раёнах на вілейшчыне, мядзельшчыне, можна ўбачыць сляды гэтай барацьбы: акопы, бліндажы, сляды партызанскіх лагераў, вогнішчы і курганы, парослыя верасам ды сасняком. Гэта ўсё партызанская зона. Толькі тут ржавее жалезны лом 995 узарваных нямецкіх эшалонаў, больш 2 тысяч варожых аўтамашын і соцень іх гармат і танкаў. І так на ўсёй Беларусі.

Пад кіраўніцтвам партыі і таварыша Сталіна, пры братняй дапамозе вялікага рускага народа і народаў усяго Совецкага Саюза беларускі народ адстаяў сваю незалежнасць і зноў прыступіў да мірнага будаўніцтва.

Яшчэ перад вайной шмат дзе на былых абшарніцкіх землях і па сёлах былі арганізаваны першыя калгасы ў заходніх абласцях. І хоць вайна перашкодзіла калгаснаму будаўніцтву, але сялянства ўжо і тады мела магчымасць пераканацца ў перавазе калгаснай гаспадаркі над аднаасобнай. Некаторыя з гэтых калгасаў, як калгас «Чырвоны партызан» у вёсцы Лісуны, вытрымалі ўсе цяжкія выпрабаванні вайны і нямецкай акупацыі. Калгаснікі не далі разбурыць свой калгас варожым сілам—кулакам і іх прыслужнікам. Яны каляктыўна апрацоўвалі зямлю і ўсе прымалі актыўны ўдзел ў партызанскім руху, за што шмат хто быў узнагароджаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі. Сялянства заходніх абласцей сёння ўпэўнена становіцца на шлях калгаснага жыцця. Ужо створана звыш 3.000 калгасаў, і колькасць іх расце з кожным днём.

Трэба было бачыць у нас вясну 1949 года, калі ва ўсіх заходніх абласцях адбываліся раённыя і абласныя з'езды калгаснікаў. Па бясконцых дарогах, па старых гасцінцах, дзе толькі крануліся звонкія першыя вясенніх ручаі, ляцелі да світання чуліся галасы і песні. На вазах, на аўтамашынах з разгорнутымі сцягамі і транспарантамі ехалі калгаснікі на свой з'езд у Маладзечна.

Колькі тут было хвалюючых выступленняў!

Велізарнейшыя змены адбыліся ў заходніх абласцях Беларусі. Там, дзе раней панавала цемра, гараць агні новай соцыялістычнай культуры. Амаль усюды ліквідавана непісьменнасць. Каля поўмільёна дзяцей ходзяць у школы вучыцца на сваёй роднай мове. Упершыню адкрыты вышэйшыя навучальныя ўстановы, тэхнікумы, сотні клубаў, бібліятэк і больш тысячы хат-чытальняў. Усюды шпарка разгарнулася народная творчасць. Заслужанай славай карыстаюцца сёння хор вёскі Вялікае Падлессе, хор Гродзенскай хаты-чытальні і Беларускі Дзяржаўны ансамбль песні і танца пад кіраўніцтвам Рыгора Шырмы. Рыгор Раманавіч Шырма на працягу ўсяго свайго жыцця клапатліва збіраў беларускія народныя песні, нёс гэтыя песні ў народ. Але ў панскай Польшчы яму ўсюды ставіліся розныя перашкоды. Забаранялі яму выступаць са сваім хорам, забаранялі спяваць беларускія песні. І толькі сёння, у Совецкай Беларусі, створаны ўсе ўмовы для творчага росту яго таленавітага каляктыва і для працы самога Р. Шырмы, якому ў 1949 г. прысвоена высокае званне народнага артыста БССР.

За гады совецкай улады выраслі новыя людзі, Героі Совецкага Саюза, Героі Соцыялістычнай Працы, тысячы выдатных перадавікоў прадпрыемстваў і калгасных палёў.

Тут нельга не прыгадаць простыя і шчырыя словы, напісаныя Героем Соцыялістычнай Працы П. Л. Калолай: «Можа быць у Маскве будуць пытаць, як пражыла на свеце 56-гадовая сялянская жанчына, ці ведала яна ў сваёй бабскай долі шчасце, колькі ёй было яго адмерана і з чыіх рук яна яго атрымала. Узяла я ў сваёй дачкі-школьніцы сшытак, ручку, чарніла. Дачакалася, калі ўсе леглі спаць, і села пісаць. Рукі дрыжаць ад хвалявання. Не ведаю, чаму слёзы засцілаюць вочы. І радасна мне і сумна. То прыйдзе на памяць мінулае, як мне даводзілася дзяўчынкай у галодны год прасіць у людзей кавалак хлеба, то ўспомніш сённяшні дзень, як калгаснікі праважалі на заготпункт абоз з маім ільном, і ўсе мяне віншавалі. Узяла я вочы ад паперы, а на сцяне перада мной партрэт. Вочы глядзяць, як жывыя. Свеціцца ў іх маладосць, вера, цеплюцца ласка. Гэта з яго рук я атрымала сваё шчасце. І неяк спакойна стала на сэрцы. І на першым лістку я напісала: «Праўда аб маім жыцці».

Праўда аб жыцці тав. Калолы—праўда аб лёсе працоўных жанчын у былой Заходняй Беларусі, праўда аб пяжкім мінулым нашага народа і аб тым, як ён вырас пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Беларускі народ, згуртаваны вакол сваёй партыі і любімага правадыра таварыша Сталіна, будзе нястомна крочыць на вялікаму сталінскаму шляху да комунізма.

* * *

Міхась КАЛАЧЫНСКІ

ПАСЛЯ ВЫЗВАЛЕННЯ

Край дарагі,
Край нарачанскі!
Зямля у засені лясной!..
Я не ў дзядоў падслухаў казкі,
Што ў горы складзены табой.

Шляхакі пыльнымі салдатам
Пад посветам асенніх зор
Я сам к табе
ў трыццаць дзевятым
Прышоў ад лепельскіх азёр.

Ты мне наўсцяж прасцерла гоні
У рыжых лысінах патраў.
І я па іх, як па далоні,
Людскія крыўды прачытаў.

Убачыў нудныя асоты,
Надзелы ў лапах дзірваноў,
У вуллях выпітыя соты
Губамі прагнымі паноў;

Пярэплатаў сухія рэбры,
Цапы без справы на таках,
Азёры Мядзельшчыны ў срэбры,
Чаўны у панскіх кандалах.

Я расхінуў галлё арэшын,
Вады напіўся ля крыніц.
Пад саламяныя падстрэшшы
Прынёс калёры навальніц;

Перад людзьмі душой пакляўся
Такім зрабіць іх лёс і лад,
Каб зацвіла нэўкол зямля ўся,
Як пасля буры ціхі сад.

І клятву гэтую я здзейсніў:
Зірні цяпер, праз дзесяць год—
Не крыўды горкія, а песні
Плывуць ад захада на ўсход.

Свіцяцца рыбныя затокі,
І пчолы рояцца ў вуллі,
Шумяць у далечы шырокай
Пад вартай ясеняў палі.

Ідуць арцельныя брыгады
Змяняць аблічча сёл і рэк.
Святлом совецкае улады
Іх дзень азораны навек.

Міхась ВАСІЛЁК

Да працы-барацьбы!

У балотных зараслях з трывогай
Пяялі песні кулікі
Пра сум жыцця ў краі убогім,
Бяздольным вечна быў які.

Мяжой крывавай раз'ядналі
Маю радзіму—Беларусь,
І хмары цёмныя над намі
Зацьмілі радасці зару.

Ад году ў год драбнелі нівы,
Хто бачыў, знаў—паверыць мне,
Што не ў адной сям'і «шчаслівай»
Зямлі было па баразне.

Батрацкі, горкі хлеб найміта —
Худыя грудзі, твар бляды...
Вось як нас Польшча «паспаліта»
Карміла ў чорныя гады.

У вёскі з воблікам панурым
І днём і ноччу, без канца
Сваю «асвету» і «культуру»
Нёс шлік, асаднік, паліцай.

І прагна мы на ўсход глядзелі,
Там рос, квітнеў багаццем край.
Жылі мы бурнаю надзеяй
Разбіць жалеза панскіх крат.

Як злыя хмары, ліхагоддзі
Ў нябыт скаціліся, прайшлі.
Складаюць гімны аб свабодзе
Гаспадары свае зямлі.

Радзіма, маці дарагая,
Крыніцай б'е твой пульс жыцця.
Агні крэмлёўскіх зор над краем
Красою вечнай зіхацяць.

Заводаў, фабрык новых вежы
У бляску сонечным гараць,
Шнуры палёў, з былнёгам межы
Калгасны трактар заараў.

Дзе йшла жняя з глыбокім жалем
Шнурок-палоску сваю жаць —
Сягоння з радасцю сабралі
Калгасам буйны ураджай.

Даволі горкіх успамінаў...
Прад намі гэтулькі сяўбы.
Сям'ёй совецкаю адзінай
Шчыльней да працы-барацьбы!

Песні ўз'яднанага народа

Цяжка жылося працоўным былой Заходняй Беларусі ў фашысцкай Польшчы.

Як і сто год назад, над вузкімі палоскамі гучэла прыгонная песня-скарга, і яна не была тут анахранізмам, бо мала чым адрознівалася жыццё селяніна-бедняка ад жыцця пры панщыне. Аднак, надзея на блізкае вызваленне ніколі не пакідала працоўных. Гэту надзею ў сэрцы народа мацнавала рэволюцыйнае слова, рэволюцыйная песня. Народная творчасць, якая склалася ў тыя гады, была адным з дзейсных сродкаў барацьбы працоўных за ўз'яднанне беларускага народа. Шырока былі распаўсюджаны песні аб барацьбітах з ненавісным панскім парадкам, палітычная сатыра, вострая прыпеўка. Прапагандыстам рэволюцыйнай песні трэба было асцерагацца, каб не трапіць у лапы дэфензівы. У народзе быў вынайдзены адмысловы спосаб маскіроўкі: забароненыя тэксты выконваліся на мелодыі касцельных матываў і нават на матывы польскага гімна.

Сярод разнастайных жанраў народнай рэволюцыйнай песні асабліва шырока бытавалі частушкі. У некаторых з іх выказвалася запаветная мара народа аб калгасным жыцці:

Гонянь нас на хутары,
Хоць няма на іх пары.
Але блізка той час,
Калі будзе калгас.

Шырока вядомымі былі сатырычныя частушкі:

Людзі добрыя, скажыце,
Ці-ж нам дрэнна ў Польшчы жыці?
Праўда, б'юць нас тут, штурхаюць,
Але «панам» называюць...

За выкананне рэволюцыйных песень і частушак нямала людзей трапляла ў турмы, але і там жыла рэволюцыйная песня. Вельмі распаўсюджаным быў жанр рэволюцыйнай песні, якая складалася за турэмнымі кратамі.

Сярод шматлікіх твораў рэволюцыйнага фальклора Заходняй Беларусі многа было песень аб асобных героях-барацьбітах. Па ўсёй Заходняй Беларусі атрымала распаўсюджанне песня пра геройскі ўчынак Сяргея Прытыцкага, які забіў буйнага польскага правакатара.

Сяргей Прытыцкі — ён завецца,
Імя яго хай разнясецца
Паміж усіх працоўных мас
І будзе прыкладам для нас.

Народная творчасць Заходняй Беларусі ў аснове сваёй была прасякнута аптымістычнай верай ва ўз'яднанне са сваімі братамі — з совецкім народам. Найбольш характэрная ў гэтым сэнсе песня аб совецкай Радзіме, складзеная ў гады вядомага паўстання нарачанскіх рыбакоў:

Вясёлая старонка,
Дзе сонейка ўсходзіць, —
Народ беларускі
Вачэй стуль не зводзіць.
Хоць сёння нам вочы
Раса выядае, —
Мы верым, што скора
Зноў сонца заззяе,
Сагрэе зямельку,
Засвеціць у хаты,
Растопіць ў астрогах
Сталёвыя краты.
І выйдзем на поле
У светлы той ранак,
Запашам, засеем
Зямельку без пана.

І разам з гэтым сэрца народа загралася імем чалавека, ад якога яны чакалі дапамогі.

Імя Сталіна мы знаем,
З ім у будучыню йдзем.
Скора, скора гэта імя
Мы тут смела назавем.

Гістарычныя дні ўз'яднання адкрылі перад народнай творчасцю працоўных былой Заходняй Беларусі новыя тэмы і матывы. Народ заспяваў новыя песні. Сярод іх асаблівай папулярнасцю карысталася і карыстаецца песня «Нам прыслала Масква падкрапленне», складзеная ўдзельнікамі Падлескага народнага хора. Шырока вядома ў Пінскай і суседняй з ёю абласцях песня «Падзяка» на словы сялянкі Ніны Крамко (Стаўбцоўскі раён).

З падзякай спажуся,
З падзякай устаю,
Бо сонца ўжо свеціць
У нашым краю.
Я дзякую сіле
Чырвоных байцоў
І Сталіну бацьку,
Што ўпору прыйшоў.
Славамі не ў сілах
Я то апісаць,
Як мне цяпер міла
«Таварыш» сказаць.

Ужо дзесяць год уз'яднаны беларускі народ складае новыя песні, у якіх славіць соцыялістычнае будаўніцтва на прасторах рэспублікі. Многія песні, складзеныя ў заходніх абласцях, увайшлі ў рэпертуар самадзейных каляктываў рэспублікі. Прапагандыстамі новых песень з'яўляюцца нашы вядучыя народныя хоры. Іх у нас нямала: Падлескі, Лучынецкі, Запольскі, Ганцэвіцкі і іншыя. Гэтыя хоры часта самі з'яўляюцца стваральнікамі новых песень.

[redacted]

заслужаны дзеяч мастацтва БССР.

Хвалюючая тэма

Выдатная гістарычная падзея ў жыцці беларускага народа—уз'яднанне заходніх абласцей у адзінай Беларускай Совецкай дзяржаве—з'яўляецца адной з самых хвалюючых тэм у творчасці мастакоў Беларусі.

Многія творы, якія напісаны за дзесяць год, сведчаць пра вялікую цікавасць мастакоў да гэтай гістарычнай падзеі. Мастакі-прафесіяналы — жывапісцы, графікі, скульптары—і майстры народнай творчасці на мастацкіх палотнах, дыванах, у вышыўцы, разьбе і мазаіцы па дрэву маляўніча адлюстроўваюць велічную тэму вызвалення Заходняй Беларусі і далучэнне яе да Беларускай Совецкай дзяржавы.

28-га кастрычніка 1939 года пачаўся Народны Сход Заходняй Беларусі. Выяўляючы волю вызваленага народа, Сход 30 кастрычніка аднагалосна вырашыў устанавіць совецкую ўладу на тэрыторыі Заходняй Беларусі і звярнуўся з просьбай у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР аб прыняцці ў склад Совецкага Саюза і ўз'яднанні заходніх абласцей з Совецкай Беларуссю.

Заслужаны дзеяч мастацтва БССР Ф. Мадораў прысвяціў гэтай гістарычнай падзеі вялікае палатно «Народны Сход у Беластоку». Карціна, напісаная ў 1939 — 40 гадах, праўдзіва перадае радасць вызваленага народа, яго волю жыць і тварыць у вялікай сям'і народаў Совецкай краіны.

Мастак здолеў перадаць урачыстасць, радасць і энтузіязм вызваленых працоўных, што здзяйсняюць сваю запаветную мару аб уз'яднанні з адзінакроўнымі совецкімі братамі, з якімі іх доўгі час разлучала мяжа. Гэты энтузіязм выяўляецца ў адзіным парыве людзей, дэпутатаў народа, якія бурнымі воплескамі вітаюць выступленне тав. Прытыцкага. Урачыстасць, любоў і адданасць вялікай Совецкай Радзіме і правадыру народаў таварышу Сталіну адчуваюцца ў залі, дзе адбываецца Сход. Сцэна, упрыгожаная кветкамі, партрэты правадыроў, лозунгі і транспаранты—усё гэта падкрэслівае святочнасць настрою дэпутатаў. Асабліва добра гэты настрой перададзены праз вобраз дзяўчыны на пярэднім плане сцэны з велізарным букетам кветак у руках.

Яркім сведчаннем велізарнага творчага ўздыму, абумоўленага гэтымі гістарычнымі падзеямі, з'яўляецца спецыяльны раздзел выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары БССР», якая была адкрыта ўвосень 1940 года ў сталіцы рэспублікі і часткова паказана на дэкадзе выстаўцы мастацтва БССР у Маскве. Гэты раздзел створаны ў значнай ступені рукамі мастакоў—выхадцаў з заходніх абласцей Беларусі. Ён налічваў звыш 150 твораў прафесійнага і самадзейнага мастацтва.

Многа мастацкіх твораў прысвечана жыццю і барацьбе працоўных Заходняй Беларусі супраць польскіх паноў.

Гравюра В. Ціхановіча «Пацыфікацыя» пераканальна паказвае нетрываласць былога буржуазна-памешчыцкага ладу польскай дзяржавы, аблічча яго жорсткіх і палахлівых дзеячоў, якія намагаліся ператварыць заходнія вобласці Беларусі ў калонію панскай Польшчы.

Многа работ прысвечана векапомнай дате 17 верасня 1939 года. Асабліва вылучаецца сярод іх карціна «Гродна, 1939 г.» мастака А. Мазылёва. Карціна адлюстроўвае гераічныя баі за вызваленне Гродна ад улады польскіх паноў. Хвалюючы момант радаснай сустрэчы вызваленага Совецкай Арміяй насельніцтва з мужнымі совецкімі воінамі добра перададзены на палатне мастака М. Манасзона «Сустрэча танкістаў з насельніцтвам Заходняй Беларусі». Складаная і многагадовая кампазіцыя паказвае сустрэчу атрада совецкіх танкістаў з жыхарамі аднаго з гарадоў. Пераможным маршам ідуць наперад совецкія воіны. Радасныя людзі сустракаюць іх з чырвонымі сцягамі, букетамі кветак, абнімаюць і цалуюць сваіх вызваліцеляў.

Гэтыя-ж матывы адлюстраваны ў радзе барэльефаў, выкананых заслужаным дзеячом мастацтва БССР, скульптарам А. Бембелем. Сярод іх: «Пераход мяжы», «Баі пад Гродна», «Сустрэча Чырвонай Арміі», «У вызваленай Заходняй Беларусі».

Векапомныя дні, актыўны ўдзел рабочых і сялян былой Заходняй Беларусі ў гістарычнай падзеі вызвалення з'явіліся тэмамі многіх работ беларускіх мастакоў. Вызваленыя рабочыя і сяляне дапамагалі совецкім воінам знішчаць банды, якія хаваліся ў лясах, пазнавалі перапранутых паноў і асаднікаў і перадавалі іх у рукі толькі-што арганізаваных органаў совецкай улады, ахоўвалі фабрыкі і заводы, помнікі культуры.

Тэме ўз'яднання беларускага народа мастакі прысвяцілі таксама рад маляўнічых плакатаў. Заслужанай увагай карыстаўся плакат «17-е верасня 1939 года», выпушчаны ў 1940 годзе. К дзесятай гадавіне ўз'яднання беларускага народа ў адзінай Беларускай Совецкай дзяржаве выпускаюцца плакаты беларускіх мастакоў, а таксама юбілейныя маркі.

Праз мастацкія вобразы мастакі выяўляюць патрыятычныя пачуцці, сваю адданасць і ўдзячнасць мудраму правадыру таварышу Сталіну.

А. ГАЛІН.

Пісьменнікі ў заходніх абласцях Беларусі

Саюз совецкіх пісьменнікаў БССР паслаў брыгады пісьменнікаў у заходнія вобласці рэспублікі.

У Полацкай вобласці з чытачамі сустрэлася брыгада пісьменнікаў у складзе С. Майхровіча, А. Астрэйкі, В. Лютавай. Маладзечанскую вобласць наведалі пісьменнікі М. Ларчанка, М. Машара, М. Калачынскі. У Баранавіцкую і Гродзенскую вобласці выязджала брыгада ў складзе Ул. Агіевіча, П. Пестрака і Я. Брыля, у Пінск — пісьменнікі М. Гамолка, Н. Тарас, Д. Кавалёў, П. Валкадаеў.

АБ СТАЛІНЕ ПЕСНІ СПЯВАЙ! СПЯВАЙ, БЕЛАРУСКІ НАРОД! (Я. Купала)

* * *

Піліп ПЕСТРАК

ЗА ДЗЕСЯЦЬ ГОД

Існаванне Саюза Совецкіх Сацыялістычных Рэспублік вызначыла шляхі змагання беларускага народа ў былой Заходняй Беларусі пад акупацыяй белапанскай Польшчы. Этапы жыцця працоўных Заходняй Беларусі — гэта этапы барацьбы за вызваленне, за лепшую долю. Змаганне за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за ўз'яднанне ў адзінай Беларускай Совецкай дзяржаве было асноўным, вядучым матывам творчасці беларускіх пісьменнікаў Заходняй Беларусі з рэвалюцыйна-дэмакратычнага лагера, якія тварылі ва ўмовах здзеку і паліцэйскага тэрору.

Беларускі народ, натхняемы дасягненнямі Совецкага Саюза, і ў прыватнасці Совецкай Беларусі, вёў непрымірымую барацьбу супраць белапольскіх акупантаў. Масавыя арышты, пасяльніцтва, жорсткі палітычны і нацыянальны ўціск былі звычайнай з'явай у жыцці працоўных. Удзельнічалі ў гэтай барацьбе і пісьменнікі. Яны клалі свае словы закліку да барацьбы і рознымі спосабамі даносілі яго да народа.

Максім Танк выдаў тры зборнікі вершаў у Вільні — «На этапах», «Журавінавы цвет» і «Пад мачтай», Валянцін Таўлай друкаваў паасобныя вершы ў часопісах, Міхась Машара выдаў зборнік вершаў «З-пад саламяных стрэх», Міхась Васілёк выпусціў кнігі «Шум баравы» і «З сялянскіх ніў»; друкавалі свае паасобныя вершы Мікола Засім, Ніна Тарас. Нялёгкая гэта была справа — друкавацца. Часопісы часта канфіскаваліся, аж пакуль зусім не былі закрыты.

Аўтару гэтых радкоў удавалася перадаваць свае вершы з турмы нелегальным спосабам, яны пасля былі данесены добрымі людзьмі да часопісаў.

Пачынаючы ад сялянскіх матываў, пісьменнікі Заходняй Беларусі паступова ўзвышаліся да асэнсавання сацыялістычнай ідэалогіі. Яны ставілі сваёй штодзённай мэтай прапаганду паэтычным словам дасягненняў Совецкага Саюза, паказвалі, што народ Заходняй Беларусі пазбаўлены самых элементарных дэмакратычных свабод.

Мужна і прызыўна гучаў голас аднаго з таленавіцейшых паэтаў былой Заходняй Беларусі — Максіма Танка.

У вершы «А сёння ідзіце» паэт пісаў пра будучыню свайго народа:

Ведаю, песні, вам хочацца струнных разораў,
Шолаху лесу зялёнага, звону азёраў,—
Сніцца не раз вам шчаслівая наша зямля.
Будзе ўсё гэта... Сталёвым нарогам падымем
Новыя дні; залатых ураджаяў зару
Збяруць у снапы маторы рукамі стальнымі,
І вёснамі будзе цвіці маладымі,
Вясёлкамі песень мая Беларусь.

Паэт-рэвалюцыянер В. Таўлай падкрэсліваў дзейсны, баявы характар паэзіі:

Я сам і пасядзець магу,
А вершам — часу шкода:
Шумець ім трэба на снягу
І калыхаць паходы.

Можна было-б прывесці многа прыкладаў жывой паэзіі, поўнай пратэсту супраць акупацыі, поўнай любві да сваёй Радзімы.

Да шчаслівых дзён верасня 1939 года дайшла са сваім паэтычным словам найбольш значная група пісьменнікаў: Максім Танк, Валянцін Таўлай, Міхась Машара, Міхась Васілёк, Мікола Засім, Ніна Тарас і аўтар гэтых радкоў. Такая вялікая падзея, як вызваленне Заходняй Беларусі Чырвонай Арміяй з-пад акупацыі польскіх паноў,—падзея, якая прывяла да ўз'яднання беларускага народа ў адзінай Беларускай Совецкай дзяржаве, паставіла перад пісьменнікамі Заходняй Беларусі задачу асэнсавання сацыялістычнага будаўніцтва ў яго канкрэтных праявах і формах, асваення матываў совецкай літаратуры.

Падобная задача нялёгкая. Новыя канкрэтныя ўмовы павінны спарадзіць новыя матывы, адпаведныя запатрабаванням часу. Гэта не азначае, што ўсё тое, што напісана раней, павінна быць закрэслена. Не, рэвалюцыйная творчасць паэтаў Заходняй Беларусі служыла справе вызвалення народа, уздымалася да вышынь сацыялістычнай ідэалогіі і сваім струменем уліваласа ў рэчышча сацыялістычнай паэзіі. Ужо адно гэта ёсць дасягненне па шляху барацьбы народа за вызваленне.

Барацьба за пабудову сацыялізма ва ўмовах, свабодных ад прыгнёту і эксплаатацыі, ва ўмовах совецкага ладу, знайшла свой водгук у творчасці пісьменнікаў былой Заходняй Беларусі. Нават за кароткі прамежак часу—ад 17 верасня 1939 года па 22 чэрвеня 1941 года, г. зн. да пачатку Вялікай Айчыннай вайны,—напісана нямала вершаў, артыкулаў, нарысаў. Але найбольшыя вынікі далі часы Айчыннай вайны, калі ў літаратуры дамінуючым матывам стаўся матыў абароны Айчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. За гэты час напісаны творы, многія з якіх стаяць на вышыні сапраўднай паэзіі. Яны поўныя гарачай любві да сваёй сацыялістычнай Радзімы, поўныя нянавісці да ворагаў. Ёсць такія вершы ў Максіма Танка, у Міхася Васілька, у Валянціна Таўлая, у Міхася Машары, у Міколы Засіма, у Ніны Тарас. Творчым дасягненнем Максіма Танка за час Айчыннай вайны з'явілася паэма «Янук Сяліба».

У пасляваенны перыяд пісьменнікі былой Заходняй Беларусі дамагліся значных дасягненняў: у Максіма Танка выйшлі зборнікі вершаў «Вастрыце зброю», «Каб ведалі» і «Выбраныя творы», у Валянціна Таўлая—зборнік вершаў «Выбранае», у Міхася Машары—зборнікі вершаў «Выбраная дірыка» і «Праз навальніцы», у Міколы Засіма—зборнік вершаў «Ад шчырага сэрца», у Ніны Тарас — зборнік вершаў «Суніцы», у аўтара гэтых радкоў — зборнік вершаў «За сваю Айчыну», «Выбраныя творы». У пасляваенны час у галіне прозы працавалі і пісьменнікі, якія паходзяць з заходніх абласцей Беларусі. Малады празаік Янка Брыль прыйшоў у літаратуру пасля Айчыннай вайны. У апошнія гады ён выдаў два зборнікі: «Апавяданні» і «Нёманскія казакі», а ў 1949 годзе напісаў першую кнігу рамана «Граніца», прысвечаную тэме барацьбы працоўных былой Заходняй Беларусі супраць белапольскай акупацыі.

Многа напісаны за пасляваенны час рад апавяданняў на партызанскую тэматыку, а да дзесяцігоддзя ўз'яднання Беларусі—першая частка рамана «Сустрэнемся на барыкадах», прысвечаная паказу рэвалюцыйнай барацьбы працоўных за сваё вызваленне з-пад акупацыі польскіх паноў.

Адзін з таленавіцейшых паэтаў, што прыйшлі з Заходняй Беларусі, Максім Танк удастоены Сталінскай прэміі за зборнік вершаў «Каб ведалі».

Ужо дзесяць год працоўныя заходніх абласцей БССР жывуць адным лёсам з народамі ўсяго Совецкага Саюза. Такі прамежак часу дае права сказаць, што справа палітычна-эканамічнага і культурнага развіцця працоўных заходніх абласцей па шляху будаўніцтва сацыялізма стала справай усіх пісьменнікаў БССР, бо розніца ў эканамічным укладзе паміж усходняй і заходняй часткамі БССР ужо настолькі сціраецца, што ўся наша рэспубліка ў гэтым сэнсе прадстаўляе сабой адно арганічна цэлае. Трэба сказаць, што беларускія пісьменнікі яшчэ ў вялікім даўгу перад народам. Гэтыя мерапрыемствы, якія праводзіць наша партыя і ўрад на землях заходніх абласцей, яшчэ не знайшлі свайго належнага адбітку ў літаратуры. Трэба мастацкім словам дапамагаць народу асвойваць калгасны лад, выкрываць ворагаў народа, дапамагаць партыі ў прапагандзе вучэння Леніна—Сталіна.

Неабходна адмовіцца ад павярхоўных твораў, дзе няма аналізу ні падзей, ні псіхалогіі чалавека, дзе не выяўляецца тэндэнцыя часу.

Толькі ўласны вопыт барацьбы за новае комуністычнае грамадства можа быць надзейнай крыніцай творчасці. Толькі праз прызму марксісцка-ленінскага вучэння рабіцца яснымі шляхі ў будучыню.

Мы маем усе магчымасці напісаць каштоўныя творы, якія на канкрэтных прыкладах жыцця народа па-мастацку раскажуць, да чаго мы імкнемся, чым жывем, дыхаем кожны дзень, як мы будуем комунізм.

Кадр з кінофільма «Шчасце народа».

* * *

Фільм аб шчасці народа

Новы хранікальна-дакумэнтальны фільм «Шчасце народа» *), выпушчаны кінастудыяй «Беларусьфільм» да дзесяцігоддзя ўз'яднання беларускага народа ў адзінай Совецкай дзяржаве, раскрывае слаўную старонку ў жыцці народа, паказвае шлях да шчасця, пройдзены за дзесяць год працоўнымі былой Заходняй Беларусі.

Фільм пачынаецца гістарычнымі кадрамі Крэмля. Дэлегацыя Народнага Сходу Заходняй Беларусі звярнулася да дэпутатаў пазачарговай Пятай сесіі Вярхоўнага Совета СССР з просьбай прыняць Заходнюю Беларусь у вялікую сям'ю Совецкага Саюза.

Збылася запаветная мара. Ад Нёмана да Буга, ад Прыпяці да бурнай Нарачы, ад Пінскіх балот да Белавежскай пушчы заззяла сонца Сталінскай Канстытуцыі. Як поўнаводная рака, свабодна і прывольна пацякло жыццё працоўных Заходняй Беларусі. Совецкая ўлада дала ім зямлю і асвету, радасную працу на заводах і фабрыках, права на адпачынак, дала ўсё тое, чаго яны былі пазбаўлены ў панскай Польшчы.

У фільме ярка паказана, як са зброяй у руках на фронце і ў партызанскіх атрадах лепшыя сыны і дочкі беларускага народа змагаліся за часць, свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы. Многія з гэтых герояў загінулі смерцю храбрых на палях бітваў. Народ ніколі не забудзе іх імён і з вялікай любоўю ўслаўляе іх светлую памяць.

Рэжысёры і апяратары фільма вялікую ўвагу звярнулі на паказ людзей, на раскрыццё іх біяграфій, іх шчаслівага сёння.

Перад намі праходзяць розныя пакаленні рабочых. Лепшыя стаханаўцы Віўкавыскага цэментнага завода — бацька і сын Хамко, будаўнікі Скідэльскага цукровага завода — Мікалай Казёл і Селівестр Гарбыль, закройшчыца Гродзенскай абутковай фабрыкі Буевіч, старая ткачыха Матруна Гусарава і маладая стаханаўка-ткачыха Марыя Падгол — гэта тыя, хто сваёй сумленнай, ударнай працай узнімаюць маладую прамысловасць заходніх абласцей.

Ткачыха Гусарава звыш дваццаці пяці год працуе на ткацкіх фабрыках. Уся маладосць яе прайшла на змрочных фабрыках панскай Польшчы. А зараз яна лепшая ткачыха Гродзенскага тонкасуконнага камбіната. Дваццаць шэсць маладых ткачых выхавала тав. Гусарава.

У 1930 годзе Селівестр Гарбыль, шукаючы шчасця і хлеба, пакінуў панскую Польшчу і стаў шахцёрам Францыі. У дні вайны змагаўся ў радах французскіх партызан. Але толькі цяпер, вярнуўшыся ў родную свабодную Беларусь, знайшоў Гарбыль сваё сапраўднае чалавечае шчасце.

Вось перадавікі сацыялістычных палёў, выдатныя майстры высокіх ураджаяў: комуністка Паліна Лаўрэнцева, звеннявая, комсамолка Лена Жалудок. На плантацыях цукровых буракоў Скідэльшчыны яны дамагліся рэкордных ураджаяў. Герой Сацыялістычнай Працы Праскоўя Калола, Васіль Качарга, Мікалай Вяленька, старшыня калгаса Уладзімір Гецман, брыгадзір Ніна Дулько, звеннявая Пелагея Апанасенкава і тысячы іншых выдатных майстроў сацыялістычных палёў — гэта залаты фонд нашага народа, гордая слава перадавікоў сельскай гаспадаркі, аб чых працоўных подзвігах ведае ўся краіна.

Фільм паказвае радасную, шчаслівую працу, вялікую любоў народа да Сталіна, клопаты дзяржавы аб дабрабыце працоўных.

Мяняецца аблічча сяла. Будуюцца электрастанцыі. У самых далёкіх вёсках запальваюцца лямпачкі Ільіча, працуюць дамы культуры, хаты-чытальні, амбулаторыі, больніцы, дзіцячыя кансультацыі.

Для дзяцей і моладзі адкрыта шырокая дарога да асветы. Сотні тысяч дзяцей наведваюць школы заходніх абласцей. У гарадах навучаюцца тысячы юнакоў і дзяўчат. Моладзь, дзеці былых батракоў, для якіх сусветныя імперыялісты рукамі пісудчыкаў рыхтавалі лёс нявольнікаў, сёння набываюць прафесіі настаўнікаў, урачоў, аграномаў.

Фільм паказвае рост культуры народа. Тут і карціны мастакоў-самавучак, і працы рэзчыкаў па дрэву, скульптараў, вышывальшчыц. У гэтых творах расказваецца аб днях вызвалення, аб радаснай працы на свабоднай зямлі. У песнях і музыцы, у танцах і вершах выказваецца бязмежная любоў да творцы перамог, да роднага Сталіна і вялікага рускага народа.

Музыка да фільма, пабудаваная на беларускіх народных песнях і матывах, пакідае добрае ўражанне.

Фільм «Шчасце народа» — добры падарунак беларускага кіномастацтва да слаўнага дзесяцігоддзя.

М. КАРАЧУН.

*) «Шчасце народа», вытворчасць кіностудыі «Беларусьфільм», 1949 г. Рэжысёры Л. Голуб, І. Шульман, сцэнарны план Янкі Брыля, апяратары М. Бераў, І. Вейняровіч, С. Фрыд, В. Цяслюк.

Самадзейнасць да свята

Нядаўна драматычны калектыў Баранавіцкага клуба чыгуначнікаў паставіў п'есу А. Сафронава «Маскоўскі характар». Новы спектакль быў цёпла прыняты гледачамі. Да дня ўз'яднання беларускага народа ў адзінай Беларускай Совецкай дзяржаве калектыў падрыхтаваў п'есу А. Астроўскага «Без віны вінаватыя» і вялікі святочны канцэрт.

Росквіт талентаў

Кожная перамога, кожная радасная з'ява ў галіне совецкага мастацтва і творчасці—вынік вялікай работы, клопатаў і любві партыі Леніна—Сталіна, якія абкружае ўвагай і падтрымкай дзеячоў культуры і мастацтва.

Звяртае ўвагу не толькі багацце тэматыкі і жанраў, але і значная мастацкая дасканаласць большасці твораў самадзейных мастакоў і майстроў народнага прыкладнога мастацтва. Усім гэтым творам, нягледзячы на своеасаблівасць кожнага з іх, уласціва адна агульная рыса — вялікі аптымізм, радаснае светаадчуванне. Для народнага выяўленчага мастацтва характэрна яго масавасць: каля 500 майстроў народнага выяўленчага мастацтва налічваецца толькі ў заходніх абласцях рэспублікі.

З жывапісных работ самадзейных мастакоў значнай увагі заслугоўваюць карціны І. Рудчыка, М. Аўчыннікава, І. Шыкіна, Я. Каўко, Д. Скакоўскага і іншых. Трое з іх — Рудчык, Аўчыннікаў і Шыкін прыняты ў члены Саюза совецкіх мастакоў БССР.

Селянін у мінулым, І. Рудчык пачаў сваю творчую дзейнасць у 1939 годзе. Першыя яго карціны «Сустрэча Чырвонай Арміі з паліцэйсколенымі» і «Сяляне паказваюць дарогу воінам Чырвонай Арміі» цікава былі вырашаны па тэме, але выкананы вельмі прымітыўнымі сродкамі. Апошнія яго работы «Пераход партызан», «Допыт нямецкага афіцэра ў партызанскім штабе» і «Выратаванне раненага камандзіра», прадстаўленыя на Усесаюзнай выстаўцы 1948 г. і Рэспубліканскай выстаўцы 1949 г., сведчаць аб вялікім творчым росце і прафесійнай дасканаласці гэтага мастака. Усе яго работы праўдзівыя і шчырыя. Кампазіцыйнае і каляровае вырашэнне іх адпавядае тэме. У карціне «Допыт нямецкага афіцэра ў партызанскім штабе» знойдзены характэрныя асаблівасці партызанскага лагера, перададзены настрой, абстаноўка і ўпэўненасць у перамозе народа над нямецкімі захопнікамі.

М. Аўчыннікаў (рабочы з гор. Брэста), як малады мастак, творча вырас асабліва ў 1948 і 1949 гадах. Усеагульнай увагай карыстаўся яго кампазіцыйны «Партрэт таварыша Сталіна». У гэтай рабоце ён стварыў выдатны вобраз правадыра ў дні перамогі над гітлераўскай Германіяй. Для карціны ўзяты вельмі цікавы момант: таварыш Сталін стаіць каля свайго рабочага стала, на якім ляжаць карты, планы, цыркуль і інш. Ён глядзіць у акно. Перад ім, на фоне Масквы — салют перамогі. Пачуццё радасці ўдала перададзена ў вобразе Генералісімуса Сталіна. Другая карціна мастака «З зямлянак у новыя дамы» экспаніравалася на Усесаюзнай выстаўцы народнага выяўленчага мастацтва. За гэтую карціну М. Аўчыннікаў атрымаў прэмію Камітэта па справах мастацтва пры Совеце Міністраў СССР.

Карціна І. Шыкіна (гор. Брэст) «На калгаснай дарозе» цікавая сваім рашэннем. У ёй мы адчуваем вялікую прастору і багацце нашай Радзімы, радасную натхнёную працу калгаснікаў. На пярэднім плане — аўтамашына, на якой едуць у поле шчаслівыя совецкія людзі, па баках—багаты калгасны ўраджай, удалечы бачны велосіпедыст, і над усім — вялікае яснае неба.

Хор Гродзенскага педінстытута.

Першыя карціны мастака Я. Каўко (г. Лунінец, Пінскай вобласці) былі прысвечаны тэме пакут беларускага народа ў часе нямецкай акупацыі. Аднак, па свайму вырашэнню яны стаялі на нізкім ідэйным і мастацкім узроўні. На гэта аўтару было своечасова ўказана. Крытыка дапамагла яму пераадолець недахопы, і ўжо на Рэспубліканскую выстаўку 1949 года ён прадставіў новыя цікавыя творы. Яго карціны «Партызанская пераправа пасля бою» і «Партызаны каля кастра» зроблены з вялікім веданнем жыцця і людзей. Абедзве карціны праўдзіва адлюстроўваюць тэму. Яны вызначаюцца кампазіцыйнай зладжанасцю і цікавым каляровым вырашэннем.

Д. Скакоўскі (Ганцэвічы, Пінскай вобласці) у рабоце «Совецкая жанчына» стварыў цікавы вобраз валявой совецкай жанчыны, будаўніка нашай дзяржавы. Малюнак у гэтым партрэце суровы і характэрны.

Сваёй пісьменнасцю і жывапіснасцю заслужылі ўсеагульную ўвагу партрэты «Герой Совецкага Саюза Маркаў» і «Дзяўчына-комсамолка», напісаныя служачым М. Лізуковым (гор. Маладзечна).

Самавучка - скульптар Ул. Ягадзінкі, пасля неаднаразовых капсультацый з боку рэспубліканскага і абласнога Дамоў народнай творчасці, пачаў хутка расці. Пазней ён быў прымацаваны для далейшай работы да заслужаных дзеячоў мастацтва БССР М. Керзіна і А. Бембеля. Пры іх дапамозе малады скульптар хутка пазбавіўся свайх ранейшых недахопаў, якія ішлі ад уплыву на яго творчасць заганных поглядаў замежных аўтараў, і стварыў цудоўную кампазіцыйную групу «Нашы». Партызанка-маці разам са сваім сынам з радасцю прыслухоўваецца да гуку совецкіх самалётаў. Двухфігурная скульптурная група вельмі добра скампанавана. Асаблівы ўдаўся вобраз жанчыны.

У 1940 годзе быў выяўлены таленавіты 13-гадовы мастак А. Засніцкі (гор. Гродна). Рэспубліканскі Дом народнай творчасці накіраваў А. Засніцкага ў школу маладых талентаў пры Ленінградскай Акадэміі мастацтва. Вайна перашкодзіла яму ў вучобе. Аднак, пасля дэмабілізацыі з армії ён з новай энергіяй узяўся за работу і стварыў вобразы герояў Айчыннай вайны. У карцінах «Канстанцін Заслонаў» і «Непакароныя» вобразы Канстанціна Заслонава і непакоранага совецкага чалавека надзвычай моцныя і выразныя.

З графічных работ вылучаюцца акварэлі і малюнкі Я. Пулхава (гор. Пінск) «Партрэт сына» і «Цецярук».

Аснўной галіной народнага дапаможнага мастацтва Беларусі з'яўляецца ткацтва. Нягледзячы на складанасць выканання тэматычных работ у ткацтве, лепшыя ткачыхі працуюць над пано, дываванамі, габенамі на совецкія тэмы. Ткачыха М. Міхан (Баранавіцкая вобласць) выткала тэкстыўнае дэкаратыўнае пано «Падзяка таварышу Сталіну». Пано надзвычай цікавае па кампазіцыі самога тэкста і па арнамэнтоўцы. Ткачыхі Варабей і Жабінская (Брэсцкая вобласць) выткалі партрэт К. Е. Варашылава. Таленавітая маладая ткачыха М. Грушэвіч-Каралёва рыхтуе дыван на тэму «Мічурынская навука ў сельскай гаспадарцы». Цікавыя дываны С. Пухавай, Ю. Фалькоўскай, А. Федзіш і іншых сялянак Гродзенскай вобласці.

З работ па вышыўцы варта адзначыць «Герб БССР», вышыты рознакаляровым шоўкам на сукне — работа пасманцаў лепшых вышывальшчыц Гродзенскага абласнога Дома народнай творчасці, «Ленін у Разліве» і «Партызанская засада» Я. Салаўянчык (гор. Гродна), партрэт І. В. Сталіна, ордэн Перамогі і «Калгасны ўраджай» работы М. Стужынскай (Маладзечанская вобласць), партрэт таварыша Сталіна работы А. Дунаевай (гор. Кобрын) і інш.

Значную ўвагу аддае народ такому віду мастацтва, як разьба па дрэву. Лепшыя рэзчыкі Я. Мацюк (Баранавіцкая вобласць), А. Шахновіч (гор. Пінск), А. Бялек (гор. Брэст) відомы за межамі рэспублікі. Я. Мацюк з'яўляецца ўдзельнікам усіх пасляваенных выставак народнага выяўленчага мастацтва. Яго работы карыстаюцца выключным поспехам у гледачоў. Сведчаннем гэтаму — шматлікія водгукі аб яго працах на старонках газет «Известия», «Советская Белоруссия», часопіса «Искусство» і інш. Цікавы вобраз партызана-сувязіста стварыў Я. Мацюк у сваёй рабоце «Пастух-сувязны». Гэта надзвычай цікавая па выразнасці мастацкага выканання работа. Трохфігурная група Я. Мацюка «Тры пакаленні ў барацьбе за Радзіму» ярка адлюстроўвае вобразы партызан, якім разведчык паказвае варожы стан. Цікавы таксама і яго барэльеф «З данясеннем».

А. Шахновіч з'яўляецца не толькі рэзчыкам па дрэву і па косці, а таксама і ксілографам. Ён вельмі многа аддае ўвагі творчай вучобе. Амаль усе яго работы прысвечаны паказу партызанскай барацьбы, сярод якіх гравюры «Партызаны каля кастра» і «Партызанская кухня». Добра выкананы барэльеф А. М. Горкага.

А. Шахновіч вельмі многа працуе над увасабленнем вобраза В. І. Леніна. Барэльефы В. І. Леніна неаднаразова выстаўлялі на рэспубліканскіх выстаўках.

Выгадна вылучаюцца таксама работы рэзчыка па дрэву А. Бялека. Яго кампазіцыйная група «Бой зуброў» вызначаецца высокім майстэрствам — гэта унікум народнай творчасці.

З інкрустацыі варта адзначыць работы майстроў М. Шудрыка (в. Пакло, Пінскай вобласці) і Ул. Лазарэвіча (г. Слонім, Баранавіцкай вобласці). М. Шудрык выканаў з рознакаляровай фанеры маляўнічы партрэт таварыша Сталіна, Ул. Лазарэвіч зрабіў інкруставаную шкатулку «Полька-Вязанка». Цікавыя шкатулкі інкруставаў з саломы Г. Герасімовіч (ст. Залессе, Маладзечанскай вобласці).

Пяжка ў кароткім артыкуле пералічыць усе дасягненні народнага мастацтва. Кожны дзень выяўляюцца ўсё новыя і новыя таленты. Вольны і шчаслівы народ не можа не тварыць, не можа не выказваць у сваіх творах высокіх патрыятычных пачуццяў, бо ён жыве пры совецкім ладзе, які стварыў усе ўмовы для народных талентаў.

Л. ЯРМОЛІНА,
заслужаны дзеяч мастацтва БССР, дырэктар Рэспубліканскага Дома народнай творчасці.

М. БЯРКОВІЧ,
загадчык аддзела выяўленчага мастацтва Рэспубліканскага Дома народнай творчасці.

Новыя творы да свята

Дзесяць год, якія мінулі з дня ўз'яднання беларускага народа, былі гадамі велізарнага росту музычнага мастацтва Совецкай Беларусі.

Праз год пасля ўступлення Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь заслужаны дзеяч мастацтва кампазітар Я. Цікоцкі піша сваю Другую сімфонію на тэму ўз'яднання. Шырокае выкарыстанне народных мелодый дало магчымасць яму напісаць твор вялікай мастацкай сілы і праўды.

Сімфонія Я. Цікоцкага малюе асобныя эпізоды барацьбы працоўных за сваю свабоду і незалежнасць. У цэнтры сімфоніі—тэма закліку, якая сваёй фанфарнай баявой інтанацыяй увасабляе ў мастацкай форме вобраз народа, яго волю да ўз'яднання. Рашучы і валявы напеў закліка, што праходзіць праз усю сімфонію, з'яўляецца выдатнай творчай удачай кампазітара. Гэты матыў цементуе ўвесь твор і надае яму адзінства і тэматычную цэласнасць.

Адначасова з сімфоніяй Я. Цікоцкага кампазітары М. Аладаў, С. Палонскі, М. Чуркін, І. Любан і іншыя напісалі рад твораў, прысвечаных гэтай векапомнай падзеі. Але самым папулярным творам у дні ўз'яднання беларускага народа была песня «Нам прислала Масква падкрапленне», створаная ў сяле Вялікае Падлессе. Баранавіцкай вобласці. Яна і сёння жыве поўнакроўным жыццём. Новы тэкст песні, створаны ў дні вызвалення Беларусі ад нямецкіх захопнікаў у 1944 годзе, зрабіў яе яшчэ больш значнай і яркай. Песня «Нам прислала Масква падкрапленне» з'яўляецца выяўленнем пачуцця любві беларускага народа да вялікага Сталіна, да рускага народа. Выкананая з вялікім поспехам на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве, песня трывала ўвайшла ў рэпертуар харавых калектываў мастацкай самадзейнасці і шырока бытуе ў нашай краіне.

Да дзесяцігоддзя з дня ўз'яднання беларускага народа кампазітар Я. Цікоцкі напісаў сімфанічную паэму «Падзяка Сталіну», якая ў лаканічнай, канкрэтна вобразнай форме раскрывае пачуцці і думкі народа, яго палымяную любоў да вялікага Сталіна. Калі ў сімфоніі пераважала тэма закліку народа да ўз'яднання, то ў сімфанічнай паэме пераважае пранікнёная народная песня аб Сталіне.

Пачынаецца паэма з эпізода, які малюе ўз'яднанне беларускага народа дзесяць год таму назад. Другі эпізод расказвае пра барацьбу народа супраць нямецкіх захопнікаў і трэці—пра вызваленне Беларусі ад нямецкіх акупантаў. У самым канцы паэмы тэма народнай песні «Падзяка Сталіну» праходзіць на ўрачыстым гучанні ўсяго аркестра.

Тэме ўз'яднання кампазітары прысвяцілі новыя песні, напісаныя на тэксты Янкі Купалы, П. Пестрака, М. Клімковіча, М. Гамолкі, М. Танка, А. Астрэйкі, А. Русака і інш.

Кампазітар Р. Пукст напісаў песню на тэкст паэта М. Гамолкі, М. Аладаў—песню «Мінула дзесяць год» на словы М. Танка. Бадзёрая, жывая мелодыя песні, блізкая да народных напеваў, пераканальна перадае радасны настрой народа. Я. Цікоцкі напісаў для змешанага хора «Песню ўз'яднання» на словы А. Русака і песню «Беларусь, старонка» на тэкст П. Пестрака. Кампазітарам М. Чуркіным створана песня на словы Янкі Купалы «Ты з Заходняй, а я з Усходняй», П. Падкавыразым на тыя-ж словы напісаны харавы твор. Н. Сакалоўскі на словы М. Клімковіча напісаў песню «Падзяка» для двухгалосага хора.

Кампазітар Ул. Алоўнікаў стварыў песні аб героях беларускага народа, аддаўшых сваё жыццё ў імя свабоды і незалежнасці сацыялістычнай Радзімы. Адна з іх — «Песня аб Даватару» надрукавана ў дадатку да часопіса «Совецкая музыка». «Песня аб Заслонаве» на словы А. Астрэйкі, напісаная для хора,—прыклад масавай песні вялікага лірычнага настрою з шырокай напеўнай мелодыкай.

Новыя творы, створаныя беларускімі кампазітарамі да дзесяцігоддзя ўз'яднання беларускага народа, — пачатак вялікай і высокароднай работы. Справа гонару беларускіх кампазітараў—напісаць новыя творы, вартыя нашага вялікага часу.

М. ЧУРКІН,
народны артыст БССР, кампазітар.

Хор калгаса імя Сталіна, Васілевіцкага раёна, Палескай вобласці.
Фота Г. Бугаенкі.

Заключны канцэрт мастацкай самадзейнасці Мінскай вобласці

Заключны канцэрт мастацкай самадзейнасці Мінскай вобласці, прысвечаны святу ўз'яднання, паказаў, што ў гарадскіх і калгасных гуртках ёсць таленавітая моладзь, якая праяўляе сябе і ў мастацкім чытанні, і ў спевах, і ў ігры на народных інструментах, і ў танцах. У рэпертуары самадзейных калектываў галоўная ўвага звернута на сучасную тэму, радзей сустракаюцца класічныя творы.

Народнасць стылю—вось што характарна для большасці калектываў, што выступалі на канцэрце. Хор Прысынкаўскай хаты-чытальні (Уздзенскі раён, кіраўнік—калгаснік Шыдлоўскі) выканаў прышэўкі пра шчаслівае і заможнае калгаснае жыццё, а таксама народную песню «Ехаў Янка ў поле», у якіх ярка паказаны новыя ўзаемадносіны совецкіх людзей і сялянская працавітасць. Надзвычай задушэўна спяваў харавы ансамбль Крупіцкай хаты-чытальні (Мінскі раён). Меладычныя народныя песні «Лянок» і «Човен» у яго выкананні прагучалі з надзвычайнай цеплынёй і лірычнай празрыстасцю. З поспехам выступіў хор соўгаса Лошыца—1 (Мінскі раён), які выканаў беларускія народныя песні «Ці ўсе лугі пакошаны» і «Ці не быстрая рэчка». Побач з народнымі песнямі харавыя калектывы выконвалі песні совецкіх кампазітараў. Змешаны хор Крупскага раёна пранікнёна выканаў «Песню аб Сталіне» С. Палонскага і «Гімн дэмакратычнай моладзі» А. Новікава.

Агульнае захапленне прысутных выклікаў запявала хора—хлопчык Кулікаў, які паказаў добрае адчуванне рытма песні і удалую перадачу яе меладычнага рысунка.

З сольных спеваў найбольшую цікавасць выклікалі: работніца дзіцячага дома гор. Чэрвеня Чапкевіч, а таксама Ячная і Расадзіна з калгаса «Пяцігодка» Смалявіцкага раёна, Саковіч і Шыдлоўская (Уздзенскі раён) і работніцы Рудзенскага торфзавода «Дукора» Варган і Каўчук.

З захапленнем сустрэў глядач выступленне вакальнага квартэта сям'і Ржэўскіх (Мінскі раён), які праспяваў калгасныя песні пра Маскву, а таксама сяцёр Сяцнёвых, якія надзвычай удала дуэтам выканалі рускую народную песню «Тройка».

Разнастайнымі нумарамі на агляде быў прадстаўлены музычны жанр. Тут і беларускія народныя песні «Ці ўсе лугі пакошаны», і народны танец «Мікіта» ў выкананні цымбальнага аркестра сям'і Гасіловіч (Дзяржынскі раён), і сучасныя песні «Наш тост» І. Любана, «Мы беларусы» Н. Сакалоўскага, «Калгасная песня аб Маскве» Маслава, беларуская полька ў выкананні ансамбля народных інструментаў пад кіраўніцтвам Ю. Бохан (калгас «Ленінскі шлях» Дзяржынскага раёна) і струннага ансамбля Верхменьскай хаты-чытальні Смалявіцкага раёна, і такія складаныя творы, як увярцюра да оперы «Кармен» Бізэ ў выкананні аркестра народных інструментаў (Крупскі раён). Гэта сведчыць аб творчым росце самадзейных музычных гурткоў.

Надзвычай цёпла была сустрэта слухачамі работніца Рудзенскай кравецкай арцелі І. Пашчанка, якая выразна і мастацкі пераканаўча прачытала гумарыстычнае апавяданне А. Чэхава «Злы хлопчык».

З народных беларускіх танцаў вызначаюцца арыгінальнасцю пастаноўкі і навізной рысунка—«Лявоніха» (в. Навасёлкі, Дзяржынскі раён) і «Крыжачок» (Плешчаніцы).

Недахопам заключнага канцэрта было тое, што ў ім адсутнічаў драматычны жанр, слаба было прадстаўлена мастацкае чытанне.

Агляд мастацкай самадзейнасці Мінскай вобласці паказаў, што кіраўнікі гурткоў павінны больш патрабавальна паставіцца да рэпертуара, больш працаваць над мастацкай дасканаласцю нумароў, над іх разнастайнасцю, займальнасцю, дасціпнасцю, паглыбляючы іх ідэйны змест. Неабходна, каб творчыя пошукі ўдзелнікаў мастацкай самадзейнасці не спыняліся. З ростам культуры гледача ўзрастаюць і новыя патрабаванні да народнага мастацтва.

М. КУЗЬМІЧОЎ.

З успамінаў маленства

★ ★ ★

Аўтар гэтых успамінаў—вясковы юнак, вучань дзесятага класа адной з сярэдніх школ Мірскага раёна, Баранавіцкай вобласці.

Родная вёска Івана—маленькае пясчанае Зарэччае—была калісь, бадай, самай беднай вёскай у ваколіцы, а хата, у якой ён рос, была найгоршай у вёсцы. За ракой, перад самымі вокнамі хат, ляжалі ажно тры невялікія маёнткі. Тым пачыналася лепшая зямля, якая належала панам. У верасні 1939 года запаветная мара зарачанцаў збылася: хлебаробы фарсіравалі раку і назаўсёды авалодалі панскім чарназёмам. Цяпер у Зарэччы калгас, вёска ўпэўненым крокам ідзе да культуры і дабрабыту. У новай хаце былога бедняка Філарэта Свірыда поўна вучняў: усе дзеці пайшлі ў навуку. Старэйшы сын Іван паспяхова канчае дзесяцігодку.

У ліпені гэтага года, калі я сустрэўся з ім на радзіме, Іван нясмела пазнаёміў мяне са сваімі першымі літаратурнымі спробамі. Бясспрэчныя прозай сшытках, са зместам якіх варта пазнаёміць грамадскасць, асабліва сёння—напярэдадні вялікага свята ўз'яднання.

Шчыры голас майго юнага земляка даношу да чытачоў без усялякіх прыкрас і дадаткаў ва ўсім яго простым і непасрэдным гучанні.

ЯНКА БРЫЛЬ.

★ ★ ★

I

Было гэта роўна адзінаццаць гадоў таму назад, яшчэ тады, калі наша мясцовасць была пад панамі.

Адойчы мы ўтрох ішлі ў школу—я, Мікола і Толік—усе з другога класа. Школы ў нашай вёсцы не было, і трэба было хадзіць у суседнюю вёску, больш чым за два кілометры. Трэба было праходзіць каля панскага маёнтка, дзе нас заўсёды сустракаў вялізны і злосны сабака. Ідучы гуртам, на некалькі хлапчукоў адразу, мы не вельмі баяліся яго, як ён ні шчэрыўся, як ні кідаўся пад ногі. Аднак, ісці без сяброў было страшна, асабліва дзяўчатам. Абрыдаў гэты сабака нам сваім прыставаннем, і вось мы пазашылі даць яму, што называецца, аднор.

Хадзілі мы ў школу вельмі рана, калі восеньскае сонца нават і не думала яшчэ паказвацца. У тую раніцу стаяў густы туман, так што на дзесяць крокаў ад сябе нельга было нічога ўбачыць. Каля рэчкі мы назбіралі каменняў, поўныя кішэні, так што цяжка было ісці. Ідучы жартавалі, загадзя смеючыся з таго, як будзе з енкам уцякаць наш злосны і страшны вораг. Адзін толькі я быў чамусьці зусім невясёлы...

Вялізныя яліны, якімі быў абсаджаны стары панскі сад, хаваліся верхавінамі ў густой імгле. Нябачныя ў гэтай імгле, на верхавінах шаўпаталіся і каркалі вароны. Я так захапіўся імі, што не заўважыў, калі мы падышлі да брамы панскага двара. Сябры ўжо трымалі каменні ў руках, і я паспяшаўся таксама ўзброіцца.

Калмач—так называлі мы панскага сабаку—выскачыў рантам з-пад брамы і з ярасным брэхам кінуўся на нас. Мы, зразумела, сустрэлі яго каменнем. Адзін камень—здаецца, Толікаў—трапіў. Сабака заенчыў і пакаціўся назад. Ды тут за брамай пачуўся крык: «Бяры, бяры яго!». Мы кінуліся наўцёкі, тым больш, што нашы кішэні былі ўжо амаль пустыя. Калмач дагнаў нас вельмі хутка, і таму прышлося зноў трымаць абарону. Разам з сабакам за намі гнаўся цяпер паніч.

На гэты раз пашанцавала мне: камень мой трапіў у нагу сабакі і ён, скуголячы, стаў уцякаць. Мы кінулі апошнія каменні і таксама далі ўцекача.

Я быў з хлопцаў найменшы і слабы, замучаны вечнай бясхлебіцай. Бег я ззаду, намагаючыся з апошніх сіл не адстаць ад сяброў. Аднак Калмач, хоць і на трох нагах, дагнаў мяне вельмі хутка. Я паспеў толькі закрычаць: «Хлопчыкі!», калі ён збіў мяне з ног і стаў кусаць. Затуліўшы твар рукамі, я крычаў, колькі мог, і адчуваў, што разам з сабакам мяне качае па траве паніч. Ён тоўк мяне ботамі пад бакі, біў па галаве і злосна лаяўся: «Я табе, хамская морда!».

Я не бачыў, як на выручку мне кінуліся сябры: я пачуў толькі, як заскуголіў сабака, а потым паніч. Яны пакінулі мяне, і я адняў ад твару рукі. Толік, мілы мой сябра Толік, замахнуўся яшчэ раз (ён кідаў вельмі далёка) і вось у спіну паніча, на вялікую радасць усім нам, грымянуў толін камень.

Найгорш пакусаны былі мае ногі. Жывот і грудзі балелі таксама, аднак вяртацца дамоў было боязна.

— Нічога, Іван, нічога,—пацяшалі мяне сябры.—Яму-ж дасталося таксама.

Каля рэчкі, дзе пад нагамі рассоўваўся мокры пясок, я зачарпнуў далонямі халоднай вады і прамыў ёю вочы. Тады вышерся зрэбным падолам кашулі, зірнуў на хлапцоў і, зусім нечакана, усе мы засмяяліся.

—Нічога,—яшчэ раз сказаў Толік,—мы яму некалі, Іван, пакажам не так.

II

Пасля мы ўтрох стаялі на каленях, адвярнуўшыся да сцяны і, як бабкі ў царкве, апусцілі галовы. Спачатку стаялі за тое, што спазніліся на першы ўрок. Стаялі доўга, пакуль настаўнік, пан Караль, не зліталваўся і не сказаў:

— Ну, сядайце, пачвары!

Мне думалася, што так і пройдзе, што ён не заўважыць ні маіх акрываўленых ног ні таго, як сабака парваў мае порткі і ў некалькіх месцах кашулю. Але Стасік, той самы паніч, зайшоў на перапынку ў пакой настаўніка, паскардзіўся яму на нас, і вось пан Караль загадаў стаяць нам дзве гадзіны на каленях пасля заняткаў.

— Калі-ж нешта такое паўторыцца яшчэ раз,—сказаў ён,—паляціце са школы, разбойнікі. Праз дзве гадзіны старожка выпусціць вас, толькі добра стаяць. Зразумелі?

Калі адзвінеў апошні званок, клас устаў на малітву. «Дзякуем табе, пане божа, за святую гэтай навукі»,—гаварылі мы хорам, і лепш за ўсіх, відаць, сэнс гэтых слоў, сапраўдны сэнс гэтага панскага свята разумеў тады я.

Пасля мы кленчылі каля сцяны, адны ў пустым класе, і раліся, што рабіць. Пан Караль паехаў дахаты: ужо даўно загуркатаў каля вакон яго матацыкл, на якім ён штодня прыязджае з маёнтку. Пайсці нам дахаты—боязна, бо заўтра аб гэтым давядаецца настаўнік. Не пайсці, а стаяць дзве гадзіны—вельмі-ж крыўдна...

— Патыдзь,—сказаў Толік, устаўшы з каленак,—ці замкнуты хоць дзверы.

Ён ціха пастукаў раз і другі раз, і вось за дзвярыма, у сенцах, нешта ціха зашастала. З таго боку дзвярэй лузганула засаўка, дзверы адчыніліся і... паказаўся светлы твар старожкавай дачкі.

— Толькі ціхенька і гародамі, — шапнула яна, усміхаючыся, як змоўшчыца.— Мама ў вёску пайшла. Пакуль прыдзе—усё чыста і гладка.

III

Мы ішлі другім берагам рэчкі, перабрыўшы яе насупраць нашай школы. Гэтак будзе смялей: не трэба праходзіць каля маёнтка з сабакам, не сустракаем ні паніча, ні настаўніка. Бераг рэчкі высокі, абрывісты. Улетку можна было-б падскочыць, прыстук. нуць нагамі, каб з берага, з норак сваіх, павыляталі спалоханыя стрыжы, «бераджанкі». Налева, за лугам—лес. Трапечаціца жоўтае лісце бярэз і алешын, паміж якіх зрэдку тырчаць цёмназялёныя верхавіны ялін. Здалёк можна падумаць, што нехта распаліў на ўзлеску вогнішча, і шызы дым папягнуўся па лесе. Перад намі, далёка наперадзе—шэрыя страхі роднай вёскі. Нашы хаты стаяць на адным баку вуліцы, вокнамі на раку. За вуліцай, да самай рэчкі-грады і вялізныя алешыны над вадой, — прыпынак птушкам.

А вось і наша старэнькая хата. Страха апусцілася амаль да зямлі, а вокны сядзяць гэтак нізка, што свіння можа пастукаць лычам у шыбу. У маёнтку за рэчкай—панскі дом вялізны, цагляны. Мне чамусьці здавалася ў той час, што ён падобны да гурмы, у якой—я ведаў ужо — сядзела шмат бедных людзей.

Уваходзячы ў сенцы, я зірнуў на сябе, і зрабілася неяк няёмка: латкі на вопратцы тырчэлі і трэсліся, нібы лісты на асіне... Мама спытала мяне: «Дзе ты быў гэтак доўга?», і я пачаў расказваць ёй аб усім. Аднак, яна ўжо ведала ўсё і сама.

— Не трэба, дзеткі, чапаць іх, праклятых,—гаварыла яна, — няхай іх, сынок, свая кашуля не чапае. Абыходзь маёнтак, як скулу ліхую. Ах, божа мой, божа...

Яна расказала мне, што ўранні, неўзабаве пасля таго, як я пайшоў у школу, прыязджаў сам пан, стасікаў бацька. Ён крычаў, што падасць на майго тату ў суд за тое, што я набіў яго сына і скалечыў сабаку. Ад суда бацька адпрасіўся, але за тое трэба было адрабіць пану тры дні з калёй. Сёння-ж тата адразу паехаў за рэчку арэць панскае поле.

Пасля я сядзеў каля стала і прагна еў салёны агурок з гарачай бульбай. Лустачку хлеба пакінуў на потым, калі буду сядзець на ложку і чытаць сваю кнігу. Кот сядзеў побач са мной, мармытаў сабе нешта пад нос і час-ад-часу працягваў лапу, чапляючыся кіпцюрамі за мой рукаў. «Гурка ён есці, вядома, не будзе»,—падумаў я і даў яму трошкі хлеба: ён-жа таксама галодны ад самага ранця.

Тады, у старых бацькавых портках, я сядзеў—калашматы, як певень—на ложку.

Бацька вярнуўся позна, увайшоў у хату, калі гарэла ўжо лучына. Мы яшчэ не вячэралі, сядзелі ўсе і чакалі яго. Бацька панура маўчаў і, здавалася мне, быў вельмі злосны. Малы Пятрусь і Алёшка сустрэлі яго вясёлым крыкам:

— Тата, татачка, мы будзем есці!

А я сядзеў і дрыжэў са страху. «Цяпер дык бацька дасць мне лупцоўкі,—думаў я. Тры дні араць! За мяне, за яшчэ адно, новае маё свавольства!..»

Але тата, на дзіва мне, не сказаў пра сабаку і Стасіка ні слова. І толькі як павячэралі, ён паклікаў маленькага Петруся, узяў яго на рукі і сказаў:

— Прыдзе і на паноў пагібель.

Іван СВІРЫД.

І. РОДЗІН

Карыфей рускай матэрыялістычнай эстэтыкі

(Да 60-годдзя з дня смерці Н. Г. Чарнышэўскага)

29 кастрычніка гэтага года споўнілася 60 год з дня смерці Нікалая Гаўрылавіча Чарнышэўскага.

Рэвалюцыйны дэмакрат, класік матэрыялістычнай філасофіі, буйнейшы сацыяліст і эканаміст, палымяны патрыёт вялікага рускага народа, Чарнышэўскі з'яўляўся таксама карыфеем рускай матэрыялістычнай эстэтыкі.

Жыццё і дзейнасць Н. Г. Чарнышэўскага разгортваліся ў эпоху прыгоннага права, у сярэдзіне мінулага стагоддзя. Тагачасныя грамадска-палітычныя абставіны і вызначылі характар яго практычнай і тэарэтычнай дзейнасці, якая аддадзена справе барацьбы з царызмам і яго «цёмным царствам».

Н. Г. Чарнышэўскі змагаўся за развіццё тых эстэтычных норм, якія ўсямерна спрыялі грамадскаму прагрэсу Расіі.

Прадаўжаючы матэрыялістычныя традыцыі ў развіцці эстэтыкі крытычнага рэалізму В. Бялінскага, Н. Чарнышэўскі распрацоўваў пытанні навуковай эстэтыкі, заснаванай класікамі марксізма.

Каштоўным у эстэтыцы Н. Чарнышэўскага з'яўляецца не толькі яе вялікае пазнавальнае значэнне, але і яе рэвалюцыйна-дэмакратычны змест. Яна была прасякнута высокімі ідэаламі барацьбы за свабоду, за народны дабрабыт, асвету і культуру.

А. А. Жданаў у сваім дакладзе аб часопісах «Звезда» і «Ленинград» з незвычайнай глыбінёй і дакладнасцю ахарактарызаваў вялікае сусветна-гістарычнае значэнне перадавой рускай рэвалюцыйна-дэмакратычнай эстэтыкі, прадстаўнікамі якой былі В. Бялінскі, Н. Чарнышэўскі, Н. Дабралюбаў і іх паслядоўнікі. Таварыш Жданаў адзначыў, што «Уся руская рэвалюцыйна-дэмакратычная публіцыстыка напоўнена смяртэльнай нянавісцю да царызма і прасякнута высокародным імкненнем змагацца за карэнныя інтарэсы народа, за яго асвету, за яго культуру, за яго вызваленне ад ланцугоў царскага рэжыма».

Н. Чарнышэўскі выпрацоўваў і развіваў сваю эстэтыку на аснове глыбокага аналіза рэальнай рэчаіснасці. Ён быў пераконаны, што рэчаіснасць павінна быць у цэнтры доследаў і ўсебаковага пазнання. Іменна з гэтых пазіцый ён і разглядаў эстэтычныя адносіны мастацтва да рэчаіснасці. «Навагу да рэальнага жыцця, недавер да апрыярычных, хоць-бы прыемных для фантазіі гіпотэз—вось характар напрамку, які нанёс цяпер у назуцы» (Чарнышэўскі — «Эстэтычныя адносіны мастацтва да рэчаіснасці»).

Н. Чарнышэўскі, будучы матэрыялістам у галіне эстэтыкі, самым рэзкім чынам крытыкаваў эстэтычны ідэал Гегеля, які зводзіўся да таго, што «цудоўнае стварэнне нашай фантазіі, а ў рэчаіснасці сапраўды цудоўнага няма». Паводле Чарнышэўскага, добрае і сапраўды цудоўнае звязана з рэальным жыццём, з самім чалавекам, з яго ўчынкамі і дзеяннямі. Прыгожае не існуе без рэальнай рэчаіснасці і без чалавека. Яно не прыносіцца ў грамадскае жыццё і прыроду аднекуль звонку. Фантазія не можа існаваць, як нейкая асобная стваральная сіла, якая здольна мяняць сутнасць рэальных адносін і вызначаць змест эстэтыкі. Прыгожай можа лічыцца такая з'ява рэчаіснасці, якая найбольш поўна выяўляе сабой жыццё такім, якім мы яго разумеем.

Цудоўным жыццём, неаднаразова падкрэсліваў Н. Чарнышэўскі, з'яўляецца працоўнае дзейснае жыццё чалавека. Толькі праца, гаворыць ён, з'яўляецца крыніцай свежасці пачуцця і сіл чалавека, у ёй заключаецца мэта жыцця, тут уся яе сутнасць. Жывы чалавек не любіць статычнага, інертнага і нерухомага.

У гэтым сцверджанні Н. Чарнышэўскага выяўляецца гарачае жаданне абараняць актыўную пераўтваральную ролю дзейнасці чалавека. Ён прыхільнік таго, каб жыццё было кіпучым і шматгранным. Іменна разнабаковасць, адзначаў Чарнышэўскі, з'яўляецца ўмовай усялякага жыцця.

У чым-жа можа выявіцца гэтая разнабаковасць?—пытаў Чарнышэўскі. І адказваў: у працы, у карысным творчай дзейнасці. У працэсе пераўтваральнай творчай працы чалавек імкнецца ахапіць усю прыроду, імкнецца надаць ёй больш энергічнае жыццё, зрабіць найбольш рацыянальныя пераўтварэнні. Асновай усялякай дзейнасці чалавека з'яўляецца рэчаіснасць. Іменна рэальнае жыццё і з'яўляецца галоўнай крыніцай мастацкай, паэтычнай, музычнай і іншай творчасці.

Прыгожае,—і ёсць жыццё.

Чарнышэўскі канкрэтна гістарычна падыходзіў да гэтага вызначэння. Ён лічыў, што разуменне прыгожага вызначаецца ў розных людзей па-рознаму і таму мае не аднолькавы змест.

Рэчаіснасць, якая існавала ў Расіі, паводле Чарнышэўскага, у ацэнцы працоўных народных мас не магла быць цудоўнай. Чаму? Таму, што яна перашкаджала выявіцца ў жыцці сапраўднай прыгажосці, а таму ва ўмовах рускага прыгоннага ладу прыгожая з'ява—рэдкасць. У процівагу «чыстым эстэтам» ён падкрэсліваў, што эстэтыка пасобна выконваць актыўную ролю ў барацьбе перадавых грамадскіх груп і класаў за рэвалюцыйнае пераўтварэнне адсталай прыгоннай рэчаіснасці. Ад яго эстэтычных поглядаў, як і ад светапогляду, веяла духам класавай барацьбы.

Н. Чарнышэўскі лічыў, што прыгожае ў соцыяльным жыцці можа быць дасягнута толькі тады, калі будуць створаны належныя ўмовы для сапраўды гарманічнага і ўсебаковага развіцця працоўных і нармальнага спалучэння духоўных і фізічных сіл чалавека. Іменна такое грамадскае жыццё ён і называў цудоўным.

Н. Чарнышэўскі адзначаў, што на свеце найбольш дасканалай істотай з'яўляецца працоўны чалавек, а таму ён і павінен лічыцца найвышэйшым праяўленнем прыгожага. Такім чынам, паводле Чарнышэўскага, найвышэйшай адзнакай цудоўнага з'яўляецца працоўнае грамадства.

Прадаўжаючы геніяльныя думкі В. Бялінскага па пытаннях эстэтыкі, крытыкі, літаратуры і мастацтва, Н. Чарнышэўскі яшчэ мацней звязаў іх з яго філасофскім матэрыялізмам і рэвалюцыйна-дэмакратычнай дзейнасцю, а таксама з жыццём перадавога рускага грамадства. Ён самым рашучым чынам падкрэсліваў сувязь эстэтыкі, літаратуры і мастацтва з палітыкай. Іменна таму Н. Чарнышэўскі настойліва сцвярджаў, што «літаратура не можа быць служкай таго ці іншага напрамку ідэі: гэта прызначэнне, якое ляжыць у яе натуры».

Рашуча выступаючы супраць тэорыі «чыстага мастацтва», прадстаўнікамі якога з'яўляліся паны-прыгоннікі і ліберальная буржуазія, Чарнышэўскі адзначаў, што «мастацтва для мастацтва» мае соцыяльна-палітычны сэнс. Прыхільнікі гэтага напрамку клапоцяцца не аб нейкім «чыстым мастацтве», якое не звязана з жыццём, а наадварот, яны ўсямерна імкнуцца падпарадкаваць мастацтва служэнню рэакцыйным эксплаататарскім мэтам.

Разбіваючы ўсялякія ідэалістычныя канцэпцыі ў мастацтве, Н. Чарнышэўскі падкрэсліваў актыўную мэтанакіраваную асаблівасць мастацтва. Сцвярджаючы няўмолчнасць прыгожага ў рэчаіснасці, ён падкрэсліваў не столькі яго значэнне для чыстага задавальнення, колькі звяртаў увагу на яго службовую ролю ў інтарэсах працоўнага народа. Іменна такое прызначэнне мастацтва павінна быць галоўным ва ўсіх відах мастацтва. Н. Чарнышэўскі горача абараняў і развіваў далей вялікі эстэтычны прынцып свайго настаўніка В. Бялінскага—«Мастацтва—для народа».

Задача мастацтва і літаратуры, у разуменні Н. Чарнышэўскага, указваў у сваім дакладзе аб часопісах «Звезда» і «Ленинград» А. А. Жданаў, зводзілася да таго, каб «навучыць людзей правільна ацэньваць тыя або іншыя грамадскія з'явы... Мастацтва мае актыўную ролю ў грамадскім жыцці, фармуючы грамадскую свядомасць».

Гэтыя вялікія прынцыпы рускай рэвалюцыйна-дэмакратычнай эстэтыкі маюць выключнае значэнне для развіцця нашай совецкай літаратуры і мастацтва. Совецкія літаратары і прадстаўнікі мастацтва не могуць і не павінны забывацца на слаўныя традыцыі перадавой рускай грамадскай і філасофскай думкі, бо лепшыя прадстаўнікі, яе разглядалі літаратуру і мастацтва як сродак служэння народу. І за гэтыя высакародныя справы, адзначаў А. А. Жданаў, «лепшыя прадстаўнікі рускай дэмакратычнай інтэлігенцыі ва ўмовах царскага ладу гінулі... ішлі на катаргу, у ссылку».

Выступаючы супраць пустога, пазбаўленага сэнсу, фармалізма ў мастацтве, сцвярджаючы і прапагандуючы баявое мастацтва, якое вядзе непрымірымую барацьбу за лепшыя ідэалы народа, Н. Чарнышэўскі лічыў важнейшым прынцыпам развіцця мастацтва метад крытычнага рэалізма, прынцып мастацкай праўдзівасці ў адлюстраванні рэчаіснасці.

Н. Чарнышэўскі настойліва падкрэсліваў, што толькі ў праўдзівым, у крытычна-рэалістычным адлюстраванні жыцця заключаецца сіла таленту, што без гэтага не атрымае належнага развіцця нават самы моцны талент. Ён правільна адзначаў, што «ілжывыя на асноўнай думцы творы бываюць слабымі нават і ў чыста мастацкіх адносінах». Зместам мастацтва павінны быць агульнанародныя задачы і інтарэсы. Чарнышэўскі сцвярджаў перавагу зместу ў мастацтве і літаратуры над формай, але пры гэтым нісколькі не адмаўляў вялікае значэння формы. Аднак, мастацкая форма ўсё-ж не выратоўвае і не можа выратаваць «ад зняважлівай або спачувальнай усмешкі твор мастацтва, калі ён важнасцю сваёй ідэі не ў стане даць адказ на пытанне: «ды ці варта было працаваць над падобнымі глупствамі?» Бескарыснае не мае права на павагу».

Гаворачы аб найбольш высокай і дасканалай форме адлюстравання прыгожага, Чарнышэўскі высока ставіў народную паэзію, асабліва тых народаў, жыццё якіх напоўнена кіпучай дзейнасцю, палымянасцю. Іменна народная паэзія заўсёды прасякнута цудоўным. Такое мастацтва належыць, паводле Чарнышэўскага, цэламу народу, бо яно пазбаўлена ўсялякай дробязнасці і безмэтаўпасці.

Н. Чарнышэўскі добра разумеў гістарычныя задачы рускага народа і пастомна змагаўся за развіццё яго культуры. Ён услед за В. Бялінскім глыбока распрацаваў матэрыялістычныя прынцыпы рэвалюцыйна-дэмакратычнай эстэтыкі і стварыў, такім чынам, трывалую тэарэтычную аснову для шырокага развіцця дэмакратычнай рускай культуры, якая з'яўлялася ў другой палове мінулага стагоддзя магутнай сілай вызваленчага руху рускага народа ў яго барацьбе з прыгоннікам.

Значэнне эстэтыкі Н. Чарнышэўскага вялікае дасягнула за межы рускай культуры. Яго эстэтыка зрабіла ўплыў на творчасць перадавых прадстаўнікоў літаратуры і мастацтва многіх народаў Расіі і Заходняй Еўропы. Асабліва моцны і дабратворны ўплыў яна зрабіла на развіццё таленту Т. Шаўчэнкі і І. Франко, Я. Купалы і Я. Коласа, А. Цэраталі і А. Купанбаева, К. Хетагурава і многіх іншых.

Совецкі народ і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва свята шануе светлую памяць аб адным з лепшых сыноў вялікага рускага народа — памяць аб вялікім рэвалюцыйным дэмакраце Н. Чарнышэўскім.

Саюз совецкіх кампазітараў БССР, Белдзяржфілармонія і кансерваторыя з глыбокім жалем паведамляюць аб заўчаснай смерці старэйшага дзеяча музычнай культуры Беларускай ССР
Сцяпана Сцяпанавіча МАРКОЎСКАГА
і выказваюць спачуванне яго сям'і.

Галоўны рэдактар М. ГОРЦАЎ.
Рэдкалегія: М. БЛІСЦІНАЎ, В. ВІТКА — нам. галоўнага рэдактара, М. КАЦАР, П. ПАДКАВЫРАЎ, П. ПАНЧАНКА, М. ПАСЛЯДОВІЧ, Я. РАМАНОВІЧ, К. САННІКАЎ.

АТ 06020. Друкарня «Чырвоны Друкар», г. Мінск, Рэвалюцыйная, 12. Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Совецкая, 34. Тэлефоны: Галоўнага рэдактара 2-31-94, сакратарыята 2-32-04.